## ЗАЎТРА — ВЯЛІКАЯ РАЗМОВА З ПРЭЗІДЭНТАМ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 1 сакавіка сустрэнецца з прадстаўнікамі грамадскасці і экспертнай супольнасці, беларускіх і замежных СМІ, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Вялікая размова з Прэзідэнтам» пройдзе ў адміністрацыйным комплексе на праспекце Пераможцаў, 14. Плануецца, што колькасць удзельнікаў мерапрыемства складзе больш за 200 чалавек. У іх ліку не толькі журналісты, але і прадстаўнікі розных сфер — палітолагі, эканамісты, работнікі рэальнага сектара эканомікі, грамадскія арганізацыі і канфесіі.

Такі адкрыты дыялог кіраўніка дзяржавы з грамадскасцю ўпершыню прайшоў у лютым 2017 года і меў вялікі грамадскі рэзананс.


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 ЛЮТАГА 2019 г. ЧАЦВЕР № 40 (28907)


# ЦЁПЛАЯ РАБОТА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Спецыялісты сталічнага прадпрыемства «Рэфрэш-К» уцяпляюць фасады буйнапанэльных шматпавярховікаў у мінскім мікрараёне Чкалаўскі.

## ЛІЧБА ДНЯ

**4 791 951**

*замежны грамадзянін, па звестках Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, наведаў Беларусь у 2018 годзе, што амаль на паўмільёна больш, чым у 2017-м. Магчымасцю наведаць нашу краіну па бязвізавым рэжыме ў 2018 годзе скарысталася больш за 100 тысяч іншаземцаў. Чакаецца, што сёлета колькасць замежных гасцей павялічыцца, бо ў чэрвені Мінск прыме II Еўрапейскія гульні, а ў верасні — лёгкаатлетычны матч Еўропа — ЗША. Экспарт турыстычных паслуг у Рэспубліцы Беларусь у студзені — лістападзе 2018 года склаў $207,2 млн, тэмп росту — 114,0 % да аналагічнага перыяду 2017 года. Турыстычная сфера ў Беларусі развіваецца ў рамках дзяржаўнай праграмы «Беларусь гасцінная», мэтай якой з'яўляецца фарміраванне і развіццё сучаснага канкурэнтаздольнага турыстычнага комплексу, унясенне ўкладу турызму ў развіццё нацыянальнай эканомікі.*




## КОРАТКА

- **ФСАН раіць ІП выкарыстоўваць электронны калькулятар для падліку сумы страхавых узносаў.**
- За час акцыі «Зробім дарогу бяспечнай!» да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 2152 пешаходы, якія парушылі ПДР, і 549 кіроўцаў, якія не выконвалі правілы праезду пешаходных пераходаў.
- **Колькасць кліентаў на Форэкс-рынку ў Беларусі за 2018 год вырасла больш чым у 3,5 раза.**
- 20-гадовы ўраджэнец Пінска, які напаў з нажом на мужа і жонку ў Кобрыне, прысуджаны да 24 гадоў калоніі.


ISSN 1990 - 763X

19040


Генетыка

# «СЛЕД» АДПАЧЫВАЕ

### Беларускія крыміналісты праз пару гадоў змогуць скласці фотаробат... па кроплі крыві

**Цяпер наша краіна ўдзельнічае ў навукова-тэхнічнай праграме Саюзнай дзяржавы «ДНК-ідэнтыфікацыя». У яе рамках плануецца распрацаваць тэхналогіі, якія дазволяць вызначаць па ДНК этнагеаграфічнае паходжанне чалавека, яго папуляцыйную прыналежнасць, узрост, некаторыя прыкметы знешнасці (колер вачэй і валасоў, целасклад). Праграма разлічана на пяць гадоў — з 2017-га да 2021-га. Вынікі збіраюцца прымяняць на практыцы. Напрыклад, пры знаходжанні на месцы забойства крыві ці сліны невядомага злачынцы, якога няма ў базе даных, будзе магчыма скласці яго партрэт.**

Важны аспект для складання партрэта — псіхаэмацыянальныя асаблівасці чалавека. Флегматык ён ці халерык — залежыць ад генаў, і ніякае выхаванне не зможа гэта змяніць. Ёсць таксама ўчасткі ДНК, якія адказваюць за схільнасць да агрэсіі.

— Колькі будзе займаць прамая расшыфроўка геному, пакуль складана сказаць. Стандартная методыка, якая сёння прымяняецца пры расследаванні важных злачынстваў, робіцца на працягу пары дзён, — дзеліцца **Сяргей БАРОЎКА, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення судова-медыцынскіх экспертыз цэнтральнага апарату Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз.**


СТАР. 4


Брэст 1000 год!

# ВІВАТ, КАРОЛЬ!

### Унікальны праект «12 артэфактаў» падрыхтаваны да юбілею горада

**Унікальны культурны праект да юбілею горада ажыццяўляе Брэсцкі абласны краязнаўчы музей. Кожны месяц на працягу тыдня выстаўляецца для экспанавання адзін музейны прадмет, звязаны з гісторыяй горада. Гэта найбольш каштоўныя артэфакты з калекцый: археалогіі, дакументаў, іканапісу і іншых, якія ўяўляюць сабой вялікую гісторыка-культурную і мемарыяльную каштоўнасць. Многія з іх, як было заяўлена, экспануюцца ўпершыню.**


СТАР. 15




Сацыяльны вектар

# НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ І ПЕРАХОД У ЭЛЕКТРОННЫ ФАРМАТ

## Над чым будзе працаваць Мінпрацы і сацабароны ў 2019 годзе

**У ліку прыярытэтных кірункаў дзейнасці ведамства — удасканаленне аплаты працы ў бюджэтнай сферы, а таксама нацыянальнай сістэмы кваліфікацый, пенсійнага забеспячэння, сацыяльных паслуг, работа над праектам стратэгіі актыўнага даўгалецця, выкананне мерапрыемстваў па рэалізацыі Канвенцыі аб правах інвалідаў і іншыя. Аб гэтым ішла гаворка на выніковай калегіі міністэрства.**

### Будзе спрошчаны парадак налічэння зарплаты бюджэтнікам

Гэта — адзін з асноўных кірункаў работы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў найбліжэйшы час, цытуе БелТА **міністра працы і сацыяльнай абароны Ірыну КАСЦЕВІЧ.**



— Тут велізарны пласт работы з пункту гледжання заканадаўства. Больш за 100 нарматыўных прававых актаў трэба будзе адмяніць, па 70 — правесці карэкціроўку, — сказала Ірына Касцевіч. — Сам указ (маецца на ўвазе ўказ № 27 па ўдасканаленні аплаты працы ў бюджэтнай сферы. — **Аўт.**) накіраваны перш за ўсё на ўдасканаленне аплаты працы. У ім выразна прапісана не дапусціць паніжэння зарплаты, але пры гэтым спрасціць парадак яе налічэння. З 27-разраднай сеткі мы пераходзім да 18-разраднай, з тарыфнай стаўкі першага разраду — на базавую стаўку.

Ужо да 1 сакавіка плануецца ўстанавіць 18-разрадную сетку і памер базавай стаўкі (гэты праект пастановы ўжо ўнесены ва ўрад), да 1 мая — вызначыць агульныя ўмовы аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый. Яе памер павінен быць не ніжэй за 80 % сярэдняй зарплаты па краіне. Дарэчы, па выніках мінулага года гэты паказчык па краіне склаў 77,2 %. Планку ў 80 % перавысілі Магілёўская, Віцебская, Гродзенская і Брэсцкая вобласці. Пры гэтым намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата ў названых рэгіёнах дасягала 802, 811, 829 і 831 рубля адпаведна. У Гомельскай і Мінскай яна была вышэйшая, а ў лідарах быў Мінск з паказчыкам 1330 рублёў.

Запланаваны таксама актыўныя меры па ўдасканаленні нацыянальнай сістэмы кваліфікацый, каб забяспечыць баланс попыту з боку наймальнікаў і прапановы ад адукацыйных устаноў. Падрыхтаваны праект адпаведнай пастановы. У сакавіку — красавіку гэтага года плануецца зацвердзіць віды дзейнасці, па якіх будуць распрацоўвацца прафесійныя стандарты — патрабаванні, што прад'яўляе наймальнік да работніка. На іх аснове плануецца скарэктаваць і адукацыйныя стандарты. Усяго за тры гады плануецца распрацаваць каля 45 прафесійных стандартаў па прыярытэтных відах эканамічнай дзейнасці. Па кожнай прафесіі такі стандарт будзе пераглядацца раз у тры гады.

Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар Петрышэнка, які прысутнічаў на калегіі ведамства, адзначыў, што асаблівую ўвагу трэба аддаць апераджальным тэмпам росту зарплаты нізкааплатных катэгорый работнікаў. Нягледзячы на дэцэнтралізацыю ў пытаннях аплаты працы бюджэтнікаў, за Мінпрацы застаюцца дакладная каардынацыя і метадалагічнае суправаджэнне.

### Дзяржава ўзмоцніць падтрымку шматдзетных сем'яў

Прапануецца змяніць падыход да выкарыстання сямейнага капіталу, перагледзець некаторыя віды дапамог па доглядзе дзяцей да трох гадоў у бок іх павелічэння і разгледзець некаторыя іншыя пытанні, якія датычацца падтрымкі сем'яў. Дзяржавай вызначаны прыярытэты, і гэта, па словах міністра працы і сацабароны, — шматдзетная сям'я.

Зараз разглядаецца магчымасць выкарыстання сямейнага капіталу датэрмінова, то-бок, да дасягнення дзіцем 18 гадоў (на адукацыю, паляпшэнне жыллёвых умоў, лячэнне і іншае). Нагадаем, што на 1 лютага гэтага года ў Беларусі адкрыта больш за 64 тысячы дэпазітных рахункаў на сямейны капітал на агульную суму 641,77 млн долараў.

Разам з тым першарадным фактарам, які ўплывае на рост нараджальнасці, Ірына Касцевіч назвала наяўнасць жылля. Пры гэтым яна спаслалася на сацыялагічныя даследаванні, падчас якіх у людзей пыталіся, што неабходна для павелічэння нараджальнасці. «На першае месца людзі ставяць жыллё, — заявіла міністр працы і сацыяльнай абароны. — Ужо прынята пастанова ўрада, не менш за 12 тысяч шматдзетных сем'яў сёлета атрымаюць кватэры. На наступны, 2020 год, узятая такая ж планка». Дарэчы, летась у нашай краіне змаглі палепшыць жыллёвыя ўмовы 8 тысяч шматдзетных сем'яў.

Чакаецца і перагляд дзіцячых дапамог у бок іх узмацнення, але ў прывязцы да колькасці дзяцей. «З кожным дзіцем выдаткі сям'і павялічваюцца. Таму наша задача — паглядзець, як падтрымаць шматдзетныя сем'і з нізкімі даходамі», — заявіла Ірына Касцевіч.

Раней у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка ў ліку мер дзяржаўнай падтрымкі, накіраваных на павышэнне нараджальнасці ў краіне, назваў прапанову ўрада залічваць у страхавы стаж для прызначэння працоўных пенсій перыяды водпуску па доглядзе дзіцяці і доглядзе дзяцей да дасягнення імі 3 гадоў, але не больш за 12 гадоў (цяпер — не больш за 9 гадоў).

Таксама сёлета пачнецца стварэнне базы шматдзетных сем'яў. Чарнавы яе варыянт павінен быць гатовы ўжо да жніўня. Мэта яе распрацоўкі — забяспечыць шматдзетныя сем'і падтрымкай у поўным аб'ёме па выяўляльным прынцыпе, бо некаторыя з іх не ведаюць у поўнай меры пра тыя гарантыі, якія ім прадугледжаны заканадаўствам.

Цяпер улік шматдзетных сем'яў вядуць тэрытарыяльныя цэнтры сацабслугоўвання насельніцтва. У іх ёсць інфармацыя аб умовах пражывання дзяцей, занятасці бацькоў, аб фактах сацыяльнага недабрабыту і цяжкай жыццёвай сітуацыі сям'і.

### Новыя падыходы да работы з людзьмі з інваліднасцю

Праект закона «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі» будзе ўнесены на разгляд у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі ўжо ў красавіку. Плануецца, што сёлета ён будзе разгледжаны ў першым чытанні.

Трэба адзначыць тры важныя інавацыйныя падыходы, якія плануецца рэалізаваць у рабоце з інвалідамі. Першы — будзе ўкаранёна паслуга персанальнага асістэнта для інваліда. Другі — будуць устанаўлівацца квоты на рабочыя месцы для асоб з інваліднасцю, каб максімальна аказаць ім садзейнічанне ў працаўладкаванні. Трэці падыход — стварэнне рэабілітацыйных цэнтраў для інвалідаў.

Праект закона ўжо ўзгоднены з усімі зацікаўленымі органамі дзяржкіравання, але ёсць некаторыя рознагалоссі з грамадскімі аб'яднаннямі. У сакавіку на ўзроўні Мінпрацы плануецца чарговая нарада, каб знайсці кампрамісныя рашэнні. Пры гэтым асаблівы акцэнт будзе зроблены на садзейнічанне занятасці людзей з інваліднасцю.

Што датычыцца паняцця «персанальны асістэнт», то яго ўвод замацуе ўжо наяўную практыку дапамогі па суправаджэнні, паслуг асабістага перакладчыка мовы жэстаў ці асістэнта для адзінокіх і адзінока пражываючых інвалідаў І і ІІ груп.

Таксама, магчыма, будзе зменены парадак забеспячэння інвалідаў тэхнічнымі сродкамі рэабілітацыі. «Хочам даць права на самастойны выбар і набыццё такіх сродкаў з наступным атрыманнем кампенсацыі», — сказала Ірына Касцевіч.

### Працягваецца работа над праектам стратэгіі актыўнага даўгалецця

Ён будзе ўнесены ў Савет Міністраў у кастрычніку. «Гэта дакумент, які па ўсіх кірунках вызначыць нашы крокі ў адносінах да пажылых ва ўсіх сферах іх жыцця», — сказала на калегіі Ірына Касцевіч.

Колькасць дамоў-інтэрнатаў у Беларусі апошнія сем гадоў захоўваецца на адным узроўні, што сведчыць аб тым, што пажылыя людзі часцей застаюцца ў хатніх умовах і пры гэтым атрымліваюць неабходны ім комплекс паслуг. Абслугоўванне дома набірае абароты: калі ў 2017 годзе яго атрымлівала амаль 90 тысяч чалавек, то ў 2018-м — ужо больш за 91 тысячу. Колькасць атрымальнікаў сацыяльных паслуг расце, з аднаго боку, у сувязі з ростам колькасці грамадзян сталага веку, з другога, з-за таго, што самі органы сацабароны больш актыўна ідуць да людзей, маючых патрэбу ў паслугах. Гэта значыць, паступова адбываецца пераход ад заяўнага да выяўляльнага прынцыпу.

«Мы зацвердзілі нацыянальны стандарт якасці сацыяльных паслуг, летась працавалі над стварэннем сістэмы маніторынгу, сёлета яго правядзём. І па выніках 2019 года ўсе 146 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва атрымаюць сваё месца ў рэйтынгу», — заявіла кіраўнік міністэрства.

### Мінпрацы спросціць і перавядзе ў электронны фармат адміністрацыйныя працэдуры

Усе адміністрацыйныя працэдуры па лініі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны будуць пераведзеныя ў электронны фармат. Гэта будзе зроблена для таго, каб людзі маглі аператыўна атрымаць паслугу. «У перспектыве — увесці праактыўную працэдуру (сэрвіс): праз тэлефон зарэгістравацца, праз яго ж атрымаць дапамогу і даведацца неабходную інфармацыю. Гэта патрабаванне жыцця, многія краіны ўжо ідуць у гэтым напрамку», — адзначае Ірына Касцевіч.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Бразілія сцягвае войскі да мяжы з Венесуэлай

Бразілія сцягвае войскі і бранятэхніку да прыгранічча з Венесуэлай тэрыторыі, пра што сведчыць відэа калоны БТР VBTP-MR Guarani, якая рухаецца да граніцы з суседняй дзяржавай. Удакладняецца, што калона складаецца з сучасных машын італьянскай распрацоўкі з улікам патрабаванняў бразільскай арміі, якія нядаўна паступілі на ўзбраенне гэтай лацінаамерыканскай краіны. Машына важыць 16,7 тоны і разлічана на 2 чалавекі. Guarani могуць быць узброены кулямётамі або гарматай. Бразільская армія цяпер з'яўляецца найбуйнейшай у Паўднёвай Амерыцы і налічвае больш за 300 тысяч вайскоўцаў і больш за 600 адзінак тэхнікі. Згодна з заявай віцэ-прэзідэнта Бразіліі Антоніу Гамілтана Маўрана, гэтая краіна не мае намеру даваць магчымасць выкарыстоўваць сваю тэрыторыю ў якасці калідора для ўварвання ў Венесуэлу. Раней падобнае развіццё падзей не выключыў дзяржсакратар ЗША Майк Пампеа.



### Мухамаду Бухары пераабралі прэзідэнтам Нігерыі



На прэзідэнцкіх выбарах у Нігерыі, якія адбыліся 23 лютага, перамогу атрымаў дзеючы кіраўнік дзяржавы Мухамаду Бухары, паведаміў Euronews. На вышэйшую пасаду прэтэндавалі больш за 70 кандыдатаў. Але асноўная барацьба разгарнулася паміж двума прадстаўнікамі мусульманскай Поўначы: Бухары і вылучаным Народна-дэмакратычнай партыяй былым віцэ-прэзідэнтам, буйным прадпрымальнікам Аціку Абубакарам. Па звестках выбарчай камісіі, Бухары набраў 56 працэнтаў галасоў. Абубакара падтрымаў 41 працэнт прагаласаваўшых выбаршчыкаў. Разам з прэзідэнцкімі ў Нігерыі адбыліся і парламенцкія выбары. За месцы ў Нацыянальным асамблеі і Сенат змагаліся прадстаўнікі 91 партыі. Паліцыя Нігерыі затрымала 128 чалавек. Іх падазраюць у гандлі галасамі, выкрадanні скрыняў для галасавання, а таксама рэгістрацыі ў якасці выбаршчыкаў пад чужымі імёнамі.

### Французскія паліцэйскія запатрабавалі ўзмацніць жорсткасць мер супраць пратэстаў

Паліцэйскія прафсаюзы французскага горада Бардо накіравалі ліст дырэктару галоўнага ўпраўлення Нацыянальнай паліцыі Эрыку Марвану, у якім паведамілі аб «крытычным» стане вартавых парадку пасля трох месяцаў пратэстаў у краіне, а таксама запатрабавалі паскорыць прыняцце закона супраць агрэсіўных дэманстрантаў, перадае ТАСС. «Паведамляем вам аб маральнай і фізічнай стомленасці нашых супрацоўнікаў, якія, апроч таго, што рызыкуюць сваім здароўем у фізічным сэнсе, падвяргаюцца ціску з боку СМІ і ў сацыяльных сетках», — сказана ў звароце. Аўтары падкрэсліваюць, што паліцэйскія падвяргаюцца празмерным нагрузкам і занадта часта становяцца мішэнню для агрэсіўных маніфестантаў, і патрабуюць паскорыць прыняцце так званага антыхуліганскага закона. Яго праект быў ухвалены ў Нацыянальным сходзе краіны і цяпер чакае разгляду ў другім чытанні ў Сенаце 12 сакавіка. Сабраныя ў ім змены павінны зрабіць больш жорсткім пакаранне для ўдзельнікаў незарэгістраваных маніфестацый і беспарадкаў.

## Сталічны ЧАС

• З моманту ўводу бескантактнай аплаты ў Мінскім метрапалітэне з выкарыстаннем банкаўскіх картак пасажыры прайшлі ў падземку амаль сем мільёнаў разоў, паведамілі БелТА на прадпрыемстве. Такая аплата праезду на турнікетах усіх станцый метрапалітэна стала даступная 12 чэрвеня мінулага года. Разлічвацца з ужываннем гэтай сістэмы могуць уладальнікі картак міжнародных плацежных сістэм Visa payWave, Mastercard Contactless і беларускай нацыянальнай плацежнай сістэмы БелКарт-Maestro. Таксама гэта можна зрабіць з дапамогай айфонаў, смартфонаў, планшэтаў, гадзіннікаў з тэхналогіяй NFC (Near field communication), якая сумяшчальная з існуючай інфраструктурай па прыёме бескантактных картак.

• Мерапрыемствы, прысвечаныя святкаванню Масленіцы, пройдуць ва ўсіх раёнах Мінска 2, 6 і 9 сакавіка, паведамілі ў прэс-службе Мінгарвыканкама. Агульнагарадской пляцоўкай гулянняў 9 сакавіка стане тэрыторыя каля Палаца спорту, дзе гасцей чакае багатае меню з традыцыйнымі і арыгінальнымі стравамі, разнастайныя конкурсы, выступленні музыкантаў, дэгустацыі. Ужо ў гэтыя выхадныя (2 сакавіка) свята адбудзецца ў Ленінскім і Фрунзенскім раёнах.

Камунальныя стасункі

# ВАДА З-ПАД КРАНА: БЕЗ РЫЗЫКІ І ФІЛЬТРАЎ

**Якасная пітная вада ва ўсёй краіне з'явіцца ў 2025 годзе, аднак і цяпер яе — і халодную, і гарачую, з-пад крана ў Мінску дарослым і дзецям можна піць без рызыкі для здароўя. І нават пах хлоркі сёлета павінен знікнуць са сталічных кранаў. Пра гэтыя і іншыя планы воднай гаспадаркі расказалі спецыялісты.**



Да 2025 года ў Беларусі запланавана будаўніцтва 500 станцый абезжалезвання, каб забяспечыць якаснай пітной вадой усю краіну. Мяркуецца, што сёлета будзе ўзведзена каля 250 такіх збудаванняў, на што з бюджэту пойдзе 50 мільёнаў рублёў.

— Для дасягнення якасці будзе весціся перападключэнне населеных пунктаў да існуючых сістэм цэнтралізаванага водазабеспячэння, дзе вада адпавядае нарматыўным паказчыкам, будаўніцтва водазаборных свідравін, а таксама закальцоўванне, — запэўніла **Марына ТОЎСЦІК, начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства ЖКГ**. — Планы намечаны паўсюдна, мы дайшлі да кожнай вёскі, дзе існуе жыццё, і разумеем, што там рабіць, каб вада была якаснай.

Пітная вада з цэнтралізаваных крыніц водазабеспячэння, у прыватнасці камунальных водаправодаў, і цяпер характарызуецца высокай эпідэміялагічнай надзейнасцю, а выпадкаў атручвання вадой не было ўжо больш як 15 гадоў, ахарактарызаваў стан вады **Аляксандр СПУРГЯШ, урач-гігіеніст рэспубліканскага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі і грамадскага здароўя**:

— Доля нестандартных мікрабіялагічных проб з водаправодаў у краіне менш за 1 %, а згодна з рэкамендацыямі СААЗ гэты паказчык не павінен перавышаць 5 %.

Каб напаць вялікі горад, у Мінску функцыянуе 354 свідравіны, 190 з якіх у рабоце штодня. На 70 % сталіца насычаецца вадой з падземных крыніц.

— Паколькі паўднёвыя воды горада больш напоўнены жалезам, чым іншыя, такую ваду прыходзіцца абезжалезваць, перш чым яна трапіць да спажыўца. У паўночна-ўсходняй частцы горада (Уручча і Зялёным Лузе) падземная вада адпавядае ўсім нормам, таму без усялякіх працэсаў водападрыхтоўкі яна трапляе праз рэзервуары чыстай вады адразу ў размеркавальную сетку сталіцы, — расказала **Наталля САЗАНАВА, намеснік начальніка вытворчасці УП «Мінскводаканал»**.

Якасць пітной вады кантралюецца штодзённа. Яна правяраецца па хімічных, мікрабіялагічных і радыялагічных паказчыках.

— Рабочай праграмай на год запланавана зрабіць каля 120 тысяч аналізаў вады, аднак гэты паказчык перавыконваецца, як правіла, на чвэрць, — заўважыла **Наталля ГРУШНІК, начальнік хіміка-бактэрыялагічнай лабараторыі УП «Мінскводаканал»**. — Мы абавязкова адбіраем пробы пасля санітарна-тэхнічных прамывак водаправоднай сеткі, а таксама пасля ўсіх інцыдэнтаў на сетках.

**Ірына СІДАРОК.**

Супрацоўніцтва

# СПРАВА ДА ТАЛІНА ДАВЯДЗЕ

**Эстонскія прадпрымальнікі прыехалі ў нашу сталіцу, каб знайсці партнёраў і ўсталяваць працоўныя кантакты. У сустрэчы ўдзельнічалі беларускія і эстонскія бізнесмены, прадстаўнікі пасольства і гандлёва-прамысловых палат.**

**Уладзімір УЛАХОВІЧ, старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты**, адзначыў, што абедзве дзяржавы даволі падобныя: «Гэта краіны з адкрытай эканомікай. Беларусь невялікая па сучасных мерках. З іншага боку, мы маем даволі салідныя поспехі ў нашым эканамічным развіцці, і перш за ўсё ў экспарце, паколькі краіна захоўвае лідзіруючыя пазіцыі на глабальным рынку па некаторых відах прадукцыі. Мы, вядома ж, зацікаўлены і адкрытыя для таго, каб знешнеэканамічнае супрацоўніцтва развіваць, умацоўваць, паколькі гэта адна з асноў будаўніцтва нашай дзяржавы. У сувязі з гэтым мы маем вельмі добрыя магчымасці для таго, каб надаць дынаміку супрацоўніцтву з партнёрамі з Эстоніі».

**Мерыке КАКАЕЎ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Эстоніі ў Беларусі**, звяртае ўвагу, што тавараабарот паміж Беларуссю і Эстоніяй летась сур'ёзна вырас. Па даных Белстата, за студзень — лістапад 2018-га ён ужо знаходзіўся на ўзроўні 172 мільёнаў долараў, што складае 170 % да адпаведнага перыяду 2017-га. «Мы шмат рабілі ў гэтым напрамку. Ужо трэці раз у нас адбываецца бізнес-семінар. Інтарэс — і беларускіх, і эстонскіх бізнесменаў — вельмі вялікі. Мы спадзяёмся, што сёлета зможам прыняць беларускую бізнес-дэлегацыю, і я вельмі пазітыўна гляджу на будучыню. У нас ёсць месца для развіцця, таму што да 2016-га тавараабарот быў амаль паўмільярда еўра. Таму ў нас ёсць куды развівацца», — рэзюмавала спадарыня пасол. Мерыке Какаеў лічыць, што самы перспектыўны напрамак — гэта IT, бо абедзве краіны добра развіты ў гэтай галіне.

Дарэчы, з 30 мая «Белавія» запускае прамыя рэгулярныя рэйсы Мінск — Талін. «Бязвізавы рэжым ужо актывізаваў нашы дзелавыя адносіны. Спачатку пяць дзён, потым 30 — гэта паспяхова ўплывала і на турызм, і на бізнес», — пракаментавала пасол.

Сярод бізнесменаў, якія прыехалі гэтымі днямі шукаць партнёраў у Мінск, ёсць і прадстаўнік BioBag. Гэта кампанія выплабляе біяраскладальную плёнку. З яе робяць розную ўпакоўку, у тым ліку пакеты для супермаркетаў, якія не змяшчаюць анівякага пластыку і могуць быць утылізаваныя са звычайным смеццем, на кампост. Да таго ж яны вырабляюць і экалагічны аднаразовы посуд. У Беларусі кампанія шукае партнёраў, якія таксама зацікаўлены ў вырашэнні праблемы сартавання смецця і зніжэння колькасці ўжывання пластыку.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

Падаткі

# ВЫБІРАЕМ ІНСПЕКЦЫЮ НЕ ПА ПРАПІСЦЫ

**Спецыялісты падатковай галіны расказалі аб навінках у рабоце з насельніцтвам і падзяліліся планамі на будучыню.**

### Усё па рэгламенце

**Начальнік Галоўнага ўпраўлення развіцця падатковых органаў Міністэрства па падатках і зборах Сяргей ШКУТ** паведамляе, што яны плануюць завяршыць распрацоўку рэгламентаў для паслуг.

«У кожным з іх будзе ўстаноўлены час, за які плацельшчык павінен атрымаць тую ці іншую паслугу. Да канца года ў нас з'явіцца 15 такіх рэгламентаў. Ахоплены будуць фактычна ўсе асноўныя працэдуры, якія мы ажыццяўляем у дачыненні да плацельшчыкаў», — растлумачыў ён. Рэгламенты будуць размешчаны на сайце міністэрства.

За мінулы год насельніцтва звярталася ў падатковыя органы па атрыманне 60 паслуг. Самымі запатрабаванымі былі падача падатковай дэкларацыі (40,8 %), растлумачэнне заканадаўства (8,1 %), здача ўнаём жылых і нежылых памяшканняў (6,7 %).

Выразная рэгламентацыя стала магчымай дзякуючы ўкараненню з 2016 года новага фармату зносін падатковых органаў з насельніцтвам — цэнтраў абслугоўвання плацельшчыкаў (ЦАП). Там працуе электронная чарга, што і дало магчымасць прааналізаваць час аказання паслуг, а таксама час чакання кліентаў. Так, паводле звестак міністэрства, у сярэднім плацельшчык стаіць у чарзе да падатковага інспектара 3 хвіліны 28 секундаў, а на абслугоўванне аднаго кліента ідзе 6 хвілін 7 секундаў. Пры ўзнікненні спрэчных сітуацый, а таксама скаргаў на якасць паслуг, бясспрэчным аргументам з'яўляецца аўдыя- і відэазапіс.

Такія цэнтры функцыянуюць у 23 інспекцыях краіны. Сёлета плануецца адкрыць яшчэ 11 цэнтраў.

### Будучыня за электроннымі сэрвісамі

Для аказання электронных падатковых паслуг на афіцыйным сайце ведамства створаны і пастаянна ўдасканальваюцца рэсурсы «Асабісты кабінет юрыдычных асоб і ІП», «Асабісты кабінет фізічнай асобы», а таксама дванаццаць адкрытых сэрвісаў.

У раздзеле «Дэкларацыя па падаходным падатку» з'явілася магчымасць атрымаць папяровае запоўненую падатковую дэкларацыю (так званы праект дэкларацыі) на падставе звестак, што атрымліваюцца падатковымі ад дзяржаўных органаў і арганізацый, ад крыніц за межамі нашай краіны і іншых.

Цікавы раздзел «Папярэдняя рэгістрацыя», які дазваляе запісацца ў інспекцыю на зручны час. Неабходна толькі выбраць адрас, мэту візіту, дату і час, які даступны. Згаданы сэрвіс актуальны для тых інспекцый, у якіх укаранёна паслуга «электронная чарга».

Ёсць і мабільная праграма для тэлефонаў (або планшэтаў) з сістэмай android. У ёй можна падаць заяўку на атрыманне дакументаў, запісацца на асабісты прыём да кіраўніцтва інспекцый, атрымаць паведамленне на выплату зямельнага падатку і падатку на нерухомасць.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЯК СТАЦЬ БІЗНЕСМЕНАМ ЗА ЧАТЫРЫ ДНІ

**Прайсці тэст самаацэнкі асобы, падыскутаваць на тэму, якіх памылак можна пазбегнуць прадпрымальнаму чалавеку і як паспяховы бізнес суадносіцца з інтуіцыяй, даведацца, як правільна праводзіць перамовы і планаваць фінансы...**

Усё гэта і шмат іншага з 26 лютага да 1 сакавіка чакае моладзь ад 18 да 29 гадоў у бізнес-школе «Ад ідэі да бізнесу» прадпрыемства «Маладзёжная сацыяльная служба».

Для ўдзельнікаў чатырохдзённага адукацыйнага курса «Маркетынгавыя даследаванні» распрацаваны спецыяльныя лекцыі, семінары, бізнес-гульні і панэльныя дыскусіі. Для найлепшага і паспяховага засваення прадпрымальніцкіх і фінансавых азоў на занятках выкарыстоўваюць кейс-метадкі.

— У Беларусі бізнес-школа «Ад ідэі да бізнесу» працуе з 2017-га і ўжо знайшла прызнанне ў моладзі. Толькі летась мы правялі 25 адукацыйных курсаў для амаль 800 юнакоў і дзяўчат, — кажа Рыма ЕПУР, генеральны дырэктар прадпрыемства «Маладзёжная сацыяльная служба». — Праект садзейнічае развіццю патэнцыялу беларускага маладзёжнага прадпрымальніцтва. Сёння ўжо ёсць прыклады паспяхова рэалізаваных ідэй.

Стаць удзельнікам бізнес-школы можна, зарэгістраваўшыся па адрасе бізнес-інкубатара «Маладзёжнай сацыяльнай службы» http://www.mcc.by/.

**Ірына СІДАРОК.**

У сеціве

# БЕЛАРУСЬ АБЫШЛА ЯПОНІЮ І ЗША

## Па хуткасці інтэрнэту

**Тэхнічныя спецыялісты інфраструктурнага аператара beCloud паведамляюць аб павелічэнні сярэдніх хуткасцяў 4G у нашай краіне.**

Па даных аналітычнай справаздачы OpenSignal, якую апублікаваў сусветны рэйтынг развіцця тэхналогіі LTE ў свеце, узроўны паказчык сярэдняй хуткасці 4G (39,1 Мбіт/с) вывеў Беларусь на 19-ю пазіцыю. Наша краіна дзеліць гэты радок рэйтынга з Ірландыяй і Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі, Японію, Ганконг, Катар, Расію, ЗША, Германію, Ізраіль, Польшчу, Украіну і іншыя. Больш хуткасны інтэрнэт 4G у Паўднёвай Карэі, Сінгапуры, Нарвегіі, Канадзе, Францыі і Швецыі. Напрыклад, японскія абаненты карыстаюцца 4G на хуткасці 38 Мбіт/с, немецкія — 31,9 Мбіт/с, амерыканскія — 28,8 Мбіт/с.

«У гадзіны найбольшай актыўнасці абанентаў сярэднія хуткасці падаюць, што натуральна для высоканагружанай сеткі. Калі тэхналогія толькі з'явілася ў 2015 годзе, карыстальнікаў у сетткі было каля 50 тысяч, а сёння — 2 мільёны, гэта значыць, што за чатыры гады попыт вырас у 40 разоў. Вырас і аб'ём трафіка, які спажываецца. Штомесяц мы фіксуем новыя рэкорды», — падкрэслівае **генеральны дырэктар beCloud Алег СЯДЗЕЛЬНІК**.

Нават у гадзіны найменшай нагрузкі адна базавая станцыя beCloud абслугоўвае 120 тысяч абанентаў і прапускае да 3 Гб трафіка ў гадзіну. А ў гадзіны найбольшай нагрузкі (з 20.00 да 22.00) колькасць актыўных абанентаў павялічваецца больш чым утрая і дасягае 420 тысяч карыстальнікаў, а трафік на адну базавую выраслае ў шэсць разоў (да 18—20 Гб у гадзіну).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне міністру абароны Рэспублікі Беларусь генерал-лейтэнанту Раўкову Андрэю Аляксеевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырае спачуванне міністру абароны Рэспублікі Беларусь генерал-лейтэнанту Раўкову Андрэю Аляксеевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**



# «СЛЕД» АДПАЧЫВАЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

ДНК можна вылучыць з любога біялагічнага матэрыялу — валасоў, плямы поту. «Патрымайце аркуш паперы, і мы зможам вызначыць ваш генатып па пакінутым на аркушы следзе», — запэўнівае спецыяліст.

На генетычныя аналізы ў крыміналістыцы штогод ідзе больш за мільён долараў.

— Многія справы па цяжкіх злачынствах, якія не былі раскрыты дзесяцігоддзямі, следства змагло давесці да лагічнага фіналу дзякуючы вынікам генетычнай экспертызы. Інфармацыя, якую мы атрымліваем пры аналізе, можа паслужыць доказам як віны, так і, што важна, невінаватасці, — кажа Сяргей Бароўка.

Як прыклад ён успамінае адну з гучных спраў. З 1999-га па 2004 год на тэрыторыі Брэсцкай і Мінскай абласцей была здзейснена серыя згвалтаванняў. Судова-генетычныя экспертызы ўстанавілі, што злачынца — адзін і той жа мужчына, аднак знайсці яго не ўдалося. У кастрычніку 2014-га ў лясным масіве паблізу вёскі Новікі Драгічынскага раёна нейкі мужчына здзейсніў згвалтаванне. Аказалася, што генатып супадае з тым, што быў выяўлены па злачынствах дзесяцігадовай даўніны. Інфармацыя аб ДНК маньяка была таксама перададзена ў Расію. Праз пэўны час прыйшло паведамленне, што гэты ж чалавек гвалтаваў жанчын у Ленінградскай вобласці. Следчыя двух краін заняліся яго пошукамі і ў лістападзе 2015-га затрымалі 44-гадовага грамадзяніна Расіі, празванага «тушынскім маньякам». Ён быў прысуджаны Брэсцкім абласным судом да 18 гадоў пазбаўлення волі. Усяго пацярпелымі па справе прызналі 35 чалавек, у тым ліку пяцярых непаўналетніх і трох малалетніх.

У Дзяржкамітэце судовых экспертыз вядуць улік даных ДНК. Толькі ў 2017—2018 гадах туды была змешчана інфармацыя больш чым аб 150 тысячах генатыпаў падазраваных і абвінавачваных асоб, «слядоў» з месцаў нераскрытых злачынстваў.

— Я паставіў бы Беларусь на першае месца па прымяненні генетычных экспертыз у крыміналістыцы на постсавецкай прасторы. Падобныя методыкі пачалі ўкараняцца ў краіне дзесьці з сярэдзіны 1990-х гадоў. Сёння ў нас, можна сказаць, сярэдні еўрапейскі ўзровень, — лічыць эксперт. — Папулярнасць такіх даследаванняў вельмі высокая. Практычна любая крымінальная справа, дзе можа быць біялагічны матэрыял — ад крадзяжоў да забойстваў, — ахоплена генетычным аналізам. Гэта дастаткова дарагое мерапрыемства. Колькі каштуе даследаванне, можна меркаваць па экспертызе для ўстанаўлення бацькоўства: на сям'ю з трох чалавек паслуга абыходзіцца ў 300 рублёў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

## У тэму

### ПАПЯРЭДЗІЦЬ ДЫЯБЕТ І СТАЦЬ ТОПАВЫМ СПАРТСМЕНАМ

Медыкі ўпэўнены: будучыня — за малекулярнай генетыкай.

— ДНК-дыягностыку ў нас у цэнтры штогод праходзіць каля чатырох тысяч чалавек, і прыкладна 500 сем'яў праводзяць прэнатальную дыягностыку з выкарыстаннем такіх метадаў, — адзначае **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай генетыцы РНПЦ «Маці і дзіця» Ірына НАВУМЧЫК**. — Гэта дастаткова шмат. І лічба будзе павялічвацца, бо з улікам тых ведаў, якія мае сучасная медыцына пра генетыку самых розных захворванняў, перш за ўсё спадчынных, патрэба ў названых даследаваннях становіцца ўсё большай. Яны даюць магчымасць сплanаваць далейшае лячэнне дзіцяці ці прыпыніць цяжарнасць, калі цяжкае захворванне не мае эфектыўных метадаў лячэння.

Асоба на 75 працэнтаў залежыць ад генаў. І толькі на 25 — ад ладу жыцця, выхавання, навучання, трэніровак. Таму, ведаючы генатып чалавека, можна пра яго вельмі многае расказаць.

— Напрыклад, пра схільнасць да захворванняў — сардэчна-сасудзістых паталогій, дыябету. Ці астэапарозу — асабліва актуальна для жанчын, у якіх пасля клімаксу разам з эстрагенам «сыходзіць» кальцый, што прыводзіць да пераломаў. А калі да першых сімптомаў выявіць гэту схільнасць, папярэдзіць ломкасць касцей лёгка — з дапамогай малочнай дыеты, прэпаратаў кальцыю, — кажа **загадчыца лабараторыі генетыкі чалавека Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі Ірма МАСЭ**.

З 2010 года ў нашай краіне выдалі 13,5 тысячы генетычных пашпартоў. Часцей за ўсё па іх звяртаюцца жанчыны, у якіх ёсць праблема невыношвання цяжарнасці. На другім месцы пашпарты здароўя: іх робяць тыя, у чыіх бацькоў быў інфаркт, інсульт, дыябет, каб своечасова пачаць прафілактыку. На трэцім — спартыўныя пашпарты. Перш чым аддаць дзіця ў секцыю, тата і мама вырашаюць праверыць: ён спрынтар, стаер ці, напрыклад, камандны гулец.

## У зоне доступу

# НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ,

### або Інтэграцыя ў сусветную навуковую супольнасць

**42 ВНУ атрымаюць доступ да поўных тэкстаў часопісаў Elsevier. Адпаведнае пагадненне было заключана паміж галоўным інфармацыйна-аналітычным цэнтрам (ГІАЦ) Міністэрства адукацыі і кампаніяй Elsevier. Спонсарам праекта выступіў беларускі бізнесмен Леанід ЛОЗНЕР, вядомы сваімі шматлікімі валанцёрскімі праектамі і інвестыцыямі ў навуку і адукацыю.**

У рамках пагаднення доступам да сусветнай навуковай інфармацыі на платформе ScienceDirect упершыню будуць забяспечаны 42 вышэйшыя навучальныя ўстановы нашай краіны.

— ScienceDirect — найбуйнейшая навуковая база, у якой акумулюецца сусветны вопыт даследаванняў у самых розных галінах. Маючы доступ да такой інфармацыі, беларускія даследчыкі змогуць аператыўна аналізаваць разнастайныя навуковыя новаўвядзенні і не адхіляцца ад сусветнага мэйнстрыму ў навуковых пошуках, — растлумачыў важнасць падзеі **дырэктар ГІАЦ Міністэрства адукацыі Павел ЛІС**. — Спадзяёмся, што гэта дазволіць ім зрабіць якасны скачок у сферы інавацыйнай вытворчасці і вывесці беларускую навуку на прынцыпова новы ўзровень. Названы праект з'яўляецца пілотным, але мы нацэлены на ўстанаўленне надзейных доўгатэрміновых кантактаў, таму што супрацоўніцтва з Elsevier — гэта рэальны крок да інтэграцыі беларускай навукі ў сусветную інфармацыйную прастору і магчымасць заняць у ёй годнае месца.

— Сёння стартуе па-сапраўднаму беспрэцэдэнтны праект. ScienceDirect — самы цытаваны і запатрабаваны ў свеце інструмент. Для ВНУ сістэмны доступ да публікацый такога ўзроўню — гэта якасна новыя ўмовы навуковага пошуку, якія будуць спрыяць прыцягненню замежных студэнтаў і павышэнню экспарту адукацыйных паслуг, — адзначыў **рэгіянальны дырэктар Elsevier у Рэспубліцы Беларусь Сяргей РАВЯКІН**. — Мы рэалізуем сістэмны праект і спадзяёмся, што вынікі не прымусяць сябе доўга чакаць!

— Падтрымкай гэтага праекта я ў нейкім сэнсе вяртаю доўг навуковаму асяроддзю, якое сфарміравала маю асобу і мой светапогляд. І вельмі спадзяюся, што доступ да сусветнай навуковай інфармацыі дасць нашым маладым даследчыкам, акрамя ўсіх відавочных пераваг, яшчэ і пачуццё таго, што яны — неад'емная частка сусветнага навуковага асяроддзя. Мне здаецца, для маладога вучонага вельмі важна адчуваць сябе інтэграваным у сусветную навуковую супольнасць, — падзяліўся сваімі думкамі Леанід Лознер. — Гэты праект — канкрэтны ўклад у пабудову сучаснай адукацыі і стварэнне ўніверсітэта новага ўзроўню.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Здарэнне

### ТРАКТАР ПРЫЦІСНУЎ ЧАЛАВЕКА

**Ранкам ратавальнікі Добрушскага раённага падраздзялення МНС выехалі на месца, атрымаўшы паведамленне пра тое, што на трасе Р-124 адбыўся з'езд трактара «Амкадор» у меліярацыйны канал, у выніку чаго тэхнікай да канструкцый шлюза быў прыціснуты чалавек.**

Як паведамілі ў МНС, пры правядзенні работ па зварцы металічнай заслонкі шлюза адбыўся разрыў троса, якім трактар «Амкадор» утрымліваў гэтую заслонку. У выніку тэхніка звалілася ўніз і прыціснула да канструкцый шлюза мужчыну 1969 года нараджэння, які праводзіў зварачныя работы.

Работнікі МНС неадкладна прынялі рашэнне аб прыцягненні цяжкай тэхнікі — крана, які быў на балансе найбліжэйшага да месца здарэння прадпрыемства — філіяла «Добрушскага ДРБУ-150» «Гомельаблдарбуда», да прыбыцця якой ратавальнікі аказвалі псіхалагічную падтрымку пацярпеламу.

Прыбыўшы да месца выкліку кран прыўзняў упаўшы трактар «Амкадор», а работнікі МНС выцягнулі мужчыну і перадалі работнікам хуткай медыцынскай дапамогі, пасля агляду якімі пацярпелы з траўмамі быў шпіталізаваны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**Вниманию акционеров ОАО «Белсолод»**

12 марта 2019 г. по адресу: г. Иваново, ул. Полевая, 32 состоится очередное общее собрание акционеров. Начало работы собрания в 13.00. Время регистрации участников собрания – в день проведения собрания с 12.00 до 12.55. Участникам собрания иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – также доверенность или договор). С информацией (документами) при подготовке к проведению собрания можно ознакомиться с 1 марта в рабочие дни с 9.00 до 16.00.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белсолод» в 2018 году и основных направлениях деятельности Общества на 2019 год.
2. Отчет наблюдательного совета ОАО «Белсолод» за 2018 год.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии за 2018 год и заключение по бухгалтерскому балансу, отчету о прибылях и убытках, годовому отчету ОАО «Белсолод». Ознакомление Общества с заключением аудиторов.
4. Утверждение годовых отчетов, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках за 2018 год.
5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2018 год. О выплате дивидендов за 2018 год.
6. О направлениях использования чистой прибыли ОАО «Белсолод» на 2019 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета и членов ревизионной комиссии ОАО «Белсолод».
8. Об утверждении Положения о порядке определения вознаграждения членам наблюдательного совета.
9. О назначении материального вознаграждения членам ревизионной комиссии.
10. О внесении изменений в Устав ОАО «Белсолод».

Наблюдательный совет».

УНП 200075434

**Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» сообщает о проведении очередного общего собрания акционеров**

Собрание состоится 29 марта 2019 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 01.03.2019 г.

Повестка дня

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 3» за 2018 год и основных направлениях деятельности Общества на 2019 год.
2. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансовой и хозяйственной деятельности и утверждение аудиторского заключения о достоверности годовой бухгалтерской отчетности открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 3» за 2018 год.
3. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 3» за 2018 год.
4. О распределении чистой прибыли и начислении дивидендов за 2018 год.
5. О распределении чистой прибыли на 2019 год.
6. Выборы членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Об определении размера вознаграждений и компенсаций расходов членам Наблюдательного совета, ревизионной комиссии Общества за исполнение ими своих обязанностей.
8. О внесении изменений в Устав ОАО «ДСТ № 3».

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 29 марта 2019 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с документами к собранию начиная с 7 марта 2019 года по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

Справки по телефонам: 28-40-20, 23-64-24 – ОЭАиП, Наблюдательный совет.

УНП 700049607

**Отчет по использованию Местным благотворительным фондом «Дать Надежду» своего имущества за 2018 г.**

Местный благотворительный фонд был зарегистрирован в мае 2017 г.

Юридический адрес с местом нахождения руководящего органа: г. Бобруйск, Могилевская область, здание казармы 9/3 в военном городке № 9 по ул. Кирова.

Учредителем фонда является: гражданин Республики Беларусь Семенчуков Владимир Евгеньевич.

Стоимость имущества фонда за 2018 г. составляет 38 945 руб. 88 коп., в том числе Уставный фонд – 2 450 руб.

Сумма поступлений от проводимых мероприятий в соответствии с Уставом фонда за 2018 г. составляет 36 645 руб. 88 коп.

Сумма расходов на достижение общественно полезных целей в соответствии с Уставом фонда составляет 32 201 руб. 28 коп.

Сумма расходов на административно-хозяйственную деятельность составляет 4 444 руб. 60 коп.

Предпринимательскую деятельность фонд не осуществляет. Унитарных предприятий, хозяйственных обществ фондом не создавалось и в таких юридических лицах фонд не участвует.

УНП 790613339

**ОТЧЕТ Местного фонда «Центр поддержки сельского развития и предпринимательства Столинского района» об использовании своего имущества за 2018 год**

Количество учредителей Фонда – 18, в том числе 15 физических лиц.

Стоимость имущества Фонда, в том числе:

– стоимость чистых активов – 134499,14 руб., – поступления от проводимых в соответствии с Уставом Фонда мероприятий 95698,59 руб.,

– доходы от предпринимательской деятельности 9267,47 руб.,

– иные поступления, не запрещенные законодательством 15 507,05 руб.

Сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в его Уставе составила 73647,85 руб.

Фонд является учредителем унитарного предприятия «Сельская Столинщина», зарегистрированного в Едином государственном регистре за № 291046099 26 сентября 2011 года.

Фонд не является участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах и коммерческих организациях.

УНП 290460165

**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»**

29 марта 2019 года состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш», расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская, 70 (конференц-зал).

Повестка дня собрания:

1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2018 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2019 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2018 году.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности общества, распределение прибыли и убытков общества за 2018 год.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2018 год.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли (убытков) за 2018 год. О выплате дивидендов за 2018 год.
6. Утверждение направлений распределения прибыли общества на 2019 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета, его составе и ревизионной комиссии общества.
8. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Начало работы собрания в 12.00.

Регистрация участников собрания с 11.00 до 11.50.

Наблюдательный совет ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш».

УНП 500021638

Сямейная газета

Выпуск № 4 (119)

## Усё наноў

Не ведаю, як у вас, а ў мяне вясна пачынаецца з... шафы. Дакладней, з маштабнай прыборкі і сартавання ўсяго таго, што назапасілася ў ёй за некалькі доўгіх месяцаў: з некаторымі прадметамі гардэробу давядзецца без шкадавання развітацца, а іншыя рэчы, наадварот, выйдуць з ценю і будуць як мага лепей адпавядаць веснавому курсу на абуджэнне і аднаўленне.

Гэту завядзёнку я помню з дзяцінства. Як толькі станавілася канчаткова зразумела, што зіма скончыла свае штукі і «калянуля» больш не плануецца, мама рашуча абвяшчала: «Трэба разабраць на балконе». Балкон (а калі папраўдзе, то абодва) за зіму ператвараўся ў нешта сярэдняе паміж капцёркай і сталярнай майстэрняй і абяцаў ударнай працы на некалькі гадзін, а таму ні ў кога імпэту не выклікаў. Тата імгненна рабіў выгляд, што захоплены вячэрнім выпускам навін, але за столькі гадоў мама ведала ўсе любімыя мазалі і ўздыхала: «Ну добра, я сама». «Зараз жа, — ускідваўся тата, — ты як перакладзеш, то не знайсці, а там усё патрэбнае!» — «Ага, ага, і гумовыя боты, у якіх ты толькі ўвосень у грыбы ходзіш, і аблезлае футра, якім мы на зіму капусту накрывалі». — «Ідзі лепш кухонную шафу разбяры». — «А там, — урачыста прыпячатвала мама, — ляжыць стары сіфон для газіроўкі, для якога няма зменных блокаў, і патэльня, якую ты два гады не даеш выкінуць і абяцаеш адчысціць!» Сустрэча завяршалася з баявой нічыёй адзін-адзін, і да вечара балкон быў упарадкаваны такім чынам, каб у мамы рука не паднялася выкінуць штосьці «вельмі патрэбнае».

А ўвечары пачыналася другая частка Мерлезонскага балета, ужо з нашым удзелам: з шаф выцягваліся дэмісезонныя курткі, боты і паліто, і ўсё наноў перамяралася на траіх, каб зразумець, што яшчэ пяройдзе ў спадчыну малодшым, а што безнадзейна кароткае, вузкае і не падлягае рамонту. Некаторыя асабліва любімыя рэчы мы ўпотай перазахоўвалі ў розных шуфлядах па некалькі разоў — хоць, канешне, тады маміны жарты пра тое, што будзем яшчэ на сваіх дзяцей прымяраць, здаваліся цалкам нерэальнымі.

Сёння я знаходжуся з другога боку барыкад, таму, пакуль дачушкі ладзяць шоу-паказ з раскіданнем і пераапрананнем, спрабую адначасова падлічыць аб'ём і суму будучых абновак і прыкінуць, што мы будзем рабіць, калі ў іх наступіць перыяд «няма чаго насіць і няма куды складваць». Паралельна яшчэ трэба пераканаць сваіх мадэляў, што ў сакавіку ў басаножках хадзіць зарана, што вунь тая кофтачка прыгожая, хоць і цёплая, а з гэтых джынсаў, нягледзячы на бліскучага вышытага матылька, паненка вырасла яшчэ летась. А ўжо як весела шумным табарам хадзіць па крамах і гуляць у нацыянальную дзіцячую гульню «трымайце мяне сямёра, а камбінезон усё адно не апрану»... Зрэшты, пра тое, як цяжка апрануць маленькае дзіця, якое рагоча, уцякае і актыўна супрацьўляецца працэсу, добра ведаюць усе бацькі «актывістаў» дзетсадаўскага ўзросту.

І ўсё ж у гэтым ёсць асаблівае задавальненне — разбіраць усёй сям'ёй шафы і балконы, развітацца да наступнага сезона з пухавікамі і зімовымі ботамі, пазбаўляцца ад рэчаў, якія камусьці іншаму патрэбныя больш, чым табе, альбо пакінуць іх... ну хоць бы для масленічнага пудзіла. А пазней, калі ўжо дакладна пацяплее, — мыць, абавязкова да скрыпу, вочы-вокны ў доме, каб у іх ярчэй свяціла сонца, каб толькі не праспаць вясну. Каб, быць можа, калі і не пачаць з яе прыходам новае жыццё, то хоць бы навесці чысціню і парадак — і ў шафе, і на душы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Тыя, хто побач

# ТАНЦЫ ПА-ДАРОСЛАМУ,

## або Агульнае хобі як новы віток адносін



**«Дом пабудавалі, дрэваў вакол насадзілі, сына выгадавалі. Можна і факстроту навучыцца», — прыкладна так разважалі гамяльчане Генадзь і Вольга КАРЧЭЎСКІЯ, запісваючыся на занятк і дзесяць гадоў таму. Шматразовыя чэмпіёны Беларусі па спартыўных бальных танцах у катэгорыі «Сеньёры» расказалі «СГ», як квікстэп можа замяніць трэнажорку і чаму сумесны выхад на паркет — найлепшая праява пачуццяў.**

Ззянне стразаў, элегантныя прычоскі, гучная прыгожая музыка. Некалькі зусім юных пар круцяцца ў віхуры венскага вальса. У паветры вітае напружанне, і здаецца, што вось-вось на чарговым павароце нехта не паспее ўхіліцца і адбудзецца сутыкненне. Сотні іншых канкурсантаў і балельшчыкаў з трыбун назіраюць за тым, што адбываецца на паркеце. Не хаваючы эмоцый, яны выкрыкваюць імёны фаварытаў, падбадзёрваюць удзельнікаў апладысментамі. І толькі адна пара стаіць быццам паводдаль. Хударлявы высокі мужчына нетаропка ходзіць туды-сюды з задуменным поглядам. Яго спадарожніца ў цёмна-сіняй сукенцы з бірузовым пер'ем на падоле і рукавах ледзь заўважна ўстае на дыбачкі і апускаецца назад. Паміж сабой — ні слова, ні погляду.

— Перад спаборніцтвамі мы стараемся адключыцца ад усяго, каб не збіць настрой, — тлумачыць пасля Вольга. — Загаворышся, засяродзішся на нейкай дробязі — і ўсё, танец не пойдзе.

**— Як вы трапілі ў танцы?**

— Вольга — артыстка з дзяцінства, — заўважае Генадзь.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

Сапраўдны мужчына

# «Тата можа ўсё што заўгодна...»

## Нават маму ў дэкрэце падмяніць

**— Жонка ў адпачынку, дзеці крыху прыхварэлі. Таму сёння нас так шмат, — сустракае гасцей Сяргей ГАРБУНОЎ. — Гэта рэдкасць! Звычайна ўсе па сваіх справах: праца, школа, садок. Днём дома толькі я і Макар.**

**Сяргей — той рэдкі тата, які ўваходзіць у 1 % беларускіх мужчын, што сядзяць у водпуску па доглядзе дзіцяці. Мы даведаліся, ці лёгка бацьку асвоіць бліны і прычоскі і што яму дапамагае «выжыць» у дэкрэце.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Самы час!

# Сталасці трэба вучыцца з 30!

## Формула актыўнага мужчынскага даўгалецця

**Чамусьці пасля 45 гадоў нашы мужчыны пачынаюць ужо рыхтавацца да пенсіі, перастаюць весці актыўны лад жыцця і ставіць амбіцыйныя мэты. Акрамя таго, кожны другі пасля 50 пакуту ад адэномы прастаты. Каб паказаць, што можа быць інакш і ўзрост — не прычына апускаць крылы і скарацца балячкам, ініцыятыва «Самы час!» арганізуе семінары пра здароўе і даўгалецце мужчын ва ўзросце 45+. На адным з такіх мерапрыемстваў, што прайшло ў Салігорску, пабывала карэспандэнт «Звязды»: вызнала формулу актыўнага мужчынскага даўгалецця і даведалася пра самы ўразлівы мужчынскі ўзрост.**




### Дозы алкаголю і ўзровень тэстэстэрону

Тэматычныя семінары цягам двух месяцаў адбудуцца ў Валожыне, Жодзіне, Маладзечне, Слуцку і Салігорску. Па выніках арганізатары спадзяюцца не толькі зразумець мадэль паводзін мужчын і дапамагчы ім справіцца з існуючымі праблемамі, але і далучыць да барацьбы з хуткім старэннем усю краіну.

— Адсутнасць вялікай мэты дрэнна адбіваецца на актыўнасці чалавека, падразае яго крылы і ў выніку скарачае жыццё, — упэўнены **Андрэй ЭЗЕРЫН, каардынатар ініцыятывы «Самы час!».** — А паколькі многія сур'ёзныя пытанні мужчыны вырашаюць з падачы жанчын, важна, каб і прыгожая палова разумела, якая сітуацыя склалася з мужчынскім здароўем і як дапамагчы дужай палове яе вырашыць.

**Мужчынам не хапае вольнага часу, бо шмат яго адбіраюць хатнія справы, няма магчымасці расслабіцца і ўвогуле складваецца ўражанне, што «мужчына ўсім вінен».**

Ініцыятыва «Самы час!» — частка праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Прафілактыка неінфекцыйных захворванняў, прасоўванне здаровага ладу жыцця і падтрымка мадэрнізацыі сістэмы аховы здароўя ў Рэспубліцы Беларусь». У нашай краіне праект рэалізуецца з дапамогай Міністэрства аховы здароўя.

Адной з асноўных прычын смяротнасці ў Беларусі лічацца атручванне алкаголем і самагубства ў п'яным стане. Некаторыя ўрачы лічаць, што небяспечнай дозы алкаголя не існуе ўвогуле, а 300 грам спірту, выпітага цягам шасці гадзін, абавязкова прывядуць да летальнага канца. Пры гэтым варта памятаць, што піўны хмель зніжае колькасць тэстэстэрону ў крыві, які і сам з 30—35 гадоў штогод пачынае змяншацца на 1-2 %. Як вынік — фігура мужчыны пачынае станавіцца «жаночай», паўнеюць грудзі і сцёгны, з'яўляецца жывот... **Сяргей БУДАЕЎ, загадчык уралагічнага аддзялення Салігорскай раённай бальніцы,** расказваючы пра небяспеку хваробы прастаты і яе наступствы, адзначыў:

— Скрынінг раку прастаты праводзіцца ў Беларусі з 2011 года. Пачынаўся гэты працэс у нашай бальніцы, маладзечанскай установе ахове здароўя і ў Першамайскім раёне сталіцы. Дзякуючы яму на 54 % раней пачалі выяўляць рак. Для большай упэўненасці біяпсію прастаты трэба рабіць раз на два гады. А паколькі ракавая пухліна расце прыкладна дзесяць гадоў, то пасля 75 гадоў такія аналізы рабіць ужо немэтазгодна.

Яшчэ адна праблема мужчын пасля 45 — метабалічны сіндром. Як кажуць спецыялісты, калі мужчынская талія шырэйшая за 94 сантыметры, гэта нагода задумацца.

### Ён усім вінен?

Першыя вынікі перагляду стаўлення да здароўя мужчын ад праведзеных семінараў ужо назіраюцца. У Валожыне, напрыклад, на адным з прадпрыемстваў вырашылі ўвесці сістэму фінансавага стымулявання тых, хто вядзе здаровы лад жыцця.

А ў Салігорску з 1 сакавіка пачнецца пілотны праект прадпрыемства «Калійспецтранс». Каб выяўляць і карэктаваць фактары рызыкі здароўя людзей, якія працуюць у шкодных умовах, рабочым будуць замяраць артэрыяльны ціск і ўзровень цукру.

Цікавую інфармацыю атрымліваюць і ў выніку сацыялагічных даследаванняў. У Маладзечне, напрыклад, назіралі фокус-групу з 18 мужчын ва ўзросце 45+. Сацыёлагі мелі на мэце вывучыць мадэль іх паводзін, дазнацца, як яны ўспрымаюць сваё здароўе, што для іх значыць здаровы лад жыцця і як яны ўсведамляюць сваё сацыяльнае становішча. Аказалася, што мужчынам не хапае вольнага часу, бо шмат яго адбіраюць хатнія справы, няма магчымасці расслабіцца і ўвогуле складваецца ўражанне, што «мужчына ўсім вінен». Няма магчымасці адпачыць нідзе, акрамя як на дачы. Разам з тым мадэль жыцця толькі дзеля сябе ўспрымаецца мужчынамі негатыўна.

Рэспандэнты адзначылі, што для іх важнае здароўе сваё і родных, упэўненасць у заўтрашнім дні, наяўнасць прыемных «вынікаў» жыцця. Важна таксама, каб чалавек развіваўся і даведваўся пра новае, аднак нейкія сур'ёзныя задачы — гэта для маладых. Клапаціцца пра ўласнае здароўе апытаныя мужчыны не хочуць (хадзі яшчэ аналізы здавай), аднак пры гэтым крытыкуюць сістэму аховы здароўя. Баяцца стаць абузай для дзяцей і ўнукаў, аднак у іх адсутнічае дакладнае ўяўленне пра дзейнасць і лад жыцця ў старасці. Такія, часам супярэчлівыя, меркаванні адных і тых жа людзей — нагода яшчэ больш задумацца над разуменнем старасці, лічаць арганізатары.

### Уразлівы ўзрост

Павелічэнне працаздольнасці жыцця беларусаў, здаецца, з'ява добрая. Аднак наколькі актыўнымі яны застаюцца пры гэтым павелічэнні і ці гатовае наша грамадства прымаць старых? Такую праблему ўзняла на семінары **Людміла ЖЫЛЕВІЧ, галоўны пазаштатны герантолаг Міністэрства аховы здароўя Беларусі.**

— Лічыцца, што ў 40—50 гадоў у мужчын настае пік сардэчна-сасудзістых захворванняў. А з 41 да 60 гадоў — самы ўразлівы ўзрост, калі паказчык смяротнасці сярод дужай паловы найбольшы. Да гэтага ўзросту мужчына ўжо прымае масу рашэнняў, мае адказнасць, за плячыма стаяць больш маладыя, адбываюцца гарманальныя змены. Урэшце ён ставіць нейкую кропку на будучых намаганнях, і... арганізм рэагуе адпаведна. Акрамя таго, разважаючы пра заўтрашні дзень, ва ўмовах пастаяннага стрэсу мужчыны часта не ўмеюць адкрываць клапан, вось і не вытрымліваюць гэты цяжкі пераходны ўзрост.

Часцей за ўсё мужчыны паміраюць ад захворванняў органаў кровазвароту, траўмаў і новаўтварэнняў. Гэта абумоўлена шкоднымі звычкамі, пастаяннымі стрэсамі і іншымі праявамі сучаснасці.

— Навошта прырода прыдумала для чалавека стрэс? Каб мабілізаваць яго, а не разбурыць! Так што нельга раіць не падводзіць сябе пад стрэс, лепш умець да яго адаптавацца, каб адрэналін не разбурыў нас знутры, — раіць Людміла Жылевіч.

Фактары рызыкі, якія ўплываюць на развіццё раку, дарэчы, як кажа герантолаг, таксама ў большасці выпадкаў залежаць ад нашых уласных намаганняў. Генетычныя захворванні — гэта толькі 10 % прычын праблем анкалогіі. Разам з тым ні ў адной еўрапейскай краіне няма такога высокага працэнта захворванняў на рак прастаты, як у Беларусі.

— Метабалічны сіндром абумоўлены курэннем, п'янствам, малярухавым ладам жыцця, атлусценнем. І ўсё гэта звязана з нашым менталітэтам. Як расслабляюцца мужчыны? Сустрэцца з сябрамі за куфлем піва. Не дзіўна, што наступствы заваленага метабалізму спасцігаюць мужчын ужо пасля 30 гадоў, — кажа герантолаг. — Кепска ўплывае на працаглсаць жыцця мужчын таксама адзінота і дэпрэсія.

Вырашаць праблему папярэджвання захворванняў мужчын пасля 45 гадоў спартыўнымі мерапрыемствамі не варта, лічаць спецыялісты. Гэтаксама, як і пачынаць «новае здаровае жыццё» ўвесну.

— Вясна — гэта якраз час, калі мы губляем мужчын-гараджан, якія выязджаюць на дачу і стараюцца за выхадныя выканаць усё тое, што мужчынывяскоўцы робяць цягам года, — дадае Людміла Жылевіч. — Каб мужчына заставаўся здаровым фізічна, псіхалагічна і эмацыянальна, трэба пазбавіцца ад фактараў рызыкі, наладзіць харчаванне і павялічыць фізічную нагрузку. І ніякіх лекаў тады не трэба.

**Ірына СІДАРОК.**

Роўныя магчымасці

# ЦІ СТРАШНЫ «ГЕНДАР»?

**Дасягненне гендарнай роўнасці ў Беларусі — працэс, шчыра кажучы, неадназначны. Многія і сёння думаюць, што гэта выключна еўрапейскі вопыт, які не мае дачынення да нашай краіны. І ўсё ж у беларускім грамадстве і дзяржаве наспела неабходнасць прыцягваць мужчын і хлопчыкаў да прасоўвання гэтых ідэй.**

Сёння неабходна разбіць стэрэатып аб тым, што сям'я — гэта клопат жанчыны. Тым не менш гендарная палітыка Беларусі — гэта палітыка не ў інтарэсах жанчын, а палітыка раўнапраўя, роўных магчымасцяў мужчын і жанчын. Пра гэта гаварылі на рэгіянальным форуме ЮНФПА «Далучэнне мужчын і хлопчыкаў да прасоўвання роўнасці» Іаана Казана-Вішнявецкі, пастаянны каардынатар ААН у Беларусі, і Валерый Кавалькоў, намеснік міністра працы і сацабароны і член Савета па ўстойлівым развіцці Рэспублікі Беларусь.

— Сёння назіраецца паступовае змяненне ў грамадстве ўспрымання асобы бацькі. Усё больш бацькаў уключаюцца ў пытанні па доглядзе і развіцці дзяцей, гэта пазітыўная тэндэнцыя, — адзначыў ён. — Паспяхова развіваецца праект «Тата-школы», які рэалізуецца нашымі тэрытарыяльнымі цэнтрамі па ўсёй краіне. Павышаецца актыўнасць мясцовых ініцыятыў па святкаванні Міжнароднага дня бацькі.

Па даных даследавання, якое было праведзена ў 2018 годзе па міжнароднай метадалогіі «Пакаленне-гендар», больш за палову мужчын і жанчын адзначылі, што клопат аб доме і дзецях з'яўляецца агульнай задачай. Пазіцыя, што мужчына павінен больш удзяльнічаць у выхаванні дзяцей, знаходзіць водгук і на заканадаўчым узроўні: у Працоўны кодэкс нашай краіны будзе ўнесеная папраўка, што наймальнік будзе **абавязаны** даць бацьку адпачынак на 14 дзён у першыя 6 месяцаў жыцця дзіцяці. Намеснік міністра таксама сказаў, што ў Працоўны кодэкс унесены новы артыкул «дыстанцыйная занятасць», якая дапаможа жанчынам і мужчынам сумяшчаць сямейныя абавязкі і работу.



Гендарны разрыў у нашай краіне паступова скарачаецца. Гэта пацвярджаецца і міжнароднымі рэйтынгамі. Паводле версіі сусветнага эканамічнага форуму 2017 года, Беларусь паднялася ў рэйтынгу гендарнага разрыву адразу на 4 пазіцыі, сёння наша краіна займае 26 месца з 144 краін. Жанчыны ў Беларусі сёння лідзіруюць у такіх абласцях, як узровень адукацыі (у тым ліку сярод занятых у эканоміцы), удзел на рынку працы. У эканоміцы ў Беларусі сёння 52 % жанчын.

Фіёна Гіб, пасол Вялікабрытаніі ў Беларусі, лічыць, што ў пытаннях ліквідацыі хатняга гвалту мы павінны шукаць шляхі вырашэння ў разрыве стэрэатыпаў, якія глыбока ўкараніліся ў грамадстве, што патрабуе сацыяльных змен, а гэта немагчыма зрабіць без прыцягнення мужчын і хлопчыкаў:

— Нядаўна праводзіліся даследаванні датычна ўключэння жанчын у бізнес, павелічэння занятасці. Апыталі жанчын і атрымалі даволі цікавыя вынікі. Многія жанчыны скардзіліся на тое, што яны сутыкаюцца з дыскрымінацыяй: на сайтах пры прыёме на работу ў прыватных арганізацыях прад'яўляюць патрабаванні да знешнасці і ўзросту (бландзінка ад 21 да 35 гадоў).

Пасол упэўненая: для таго каб разбурыць гэтыя стэрэатыпы, трэба, каб людзі разумелі, што можна паводзіць сябе па-іншаму і думаць па-іншаму. Важна, каб мужчыны былі часткай такой гендарнай рэформы. Урад павінен займацца пытаннямі гендарнай роўнасці, гэта неабходна адлюстраваць і ў нацыянальных праграмах навучання.

Начальнік галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МГБ МУС, палкоўнік міліцыі Раман МЕЛЬНІК таксама адзначыў, што гвалт патрабуе актыўнага ўмяшання як з боку дзяржавы, так і з боку грамадства:

— Асабліва ярка падзел па палавой прыкмеце выяўляецца пры аналізе фактаў гвалту ў сям'і. Мужчыны летась склалі 90 % ад усіх абвінавачаных у здзяйсненні злачынстваў у дачыненні да членаў сям'і, у той жа час больш за 80 % пацярпелых — гэта жанчыны і дзяўчынкі. Абсалютная большасць вінаватых у здзяйсненні адміністрацыйных правапарушэнняў у побыце — гэта таксама мужчыны, а пацярпелыя — жанчыны.

**Вольга ПРАЛЮК.**

# «Тата можа ўсё што заўгодна...»



### «З чатырма дзецьмі не паспяваеш часам паесці!»

У сталічнай сям'і Гарбуновых чацвёра дзяцей: Макар, Любава, Аліна і Максім.

— Максім спяшаецца на навучальна-вытворчай камбінат. Ён адзін з Заводскага раёна вучыцца на сацработніка. Зараз едзе ў прытулак дапамагаць. Летам была практыка ў доме састарэлых. Яму падабаецца, — ганарыцца сынам **Яўгенія**. — Максім вучыць японскую мову. Амаль скончыў мастацкую школу — за тры месяцы да выпуску кінуў. Падлеткі!



— Сядайце, будзем каву піць, — заве да стала гаспадар. — Усё гатова.

— А ты спытаў, каму з цукрам, каму без? — усміхаецца жонка. — Ці ўсім як сабе зрабіў?

— Галоўнае — смачна, — адказвае Сяргей. — Спадзяюся, госці на дыетах не сядзяць? Мы з Жэняй, напрыклад, ужо месяц як пачалі рыхтавацца да лета. Заўсёды робім гэта калектыўна. Аднаму цяжка. Худзеем па дыеце Дзюкана, — тлумачыць мужчына. — У падрабязнасці лезці не буду — вам гэта не трэба. А мне матуля, калі пазваніў ёй па скайпе, аднойчы сказала: «Сынок, у цябе твар у экран не ўлазіць». Вось гэта быў сігнал!

— Мы ўжо другі раз худзеем. Зараз пакажу, якія былі раней. Не пазнаеце, — гартае фотаздымкі на планшэце Яўгенія.

— Першы раз я скінуў 18 кілаграмаў! А потым наступіў Новы год, аліўе — сарваліся! Але нічога, мы вопытныя, нагонім. Так, Макар? — бярэ малога на рукі бацька. — З чатырма дзецьмі не паспяваеш часам паесці!

### «Амаль усю мэблю ў кватэры зрабіў Сяргей»

— Усю мэблю, што бачыце ў кватэры, зрабіў Сяргей. Стол, шафа ў гасцінай, кухня — усё сам! — хваліць мужа Яўгенія. — На першым паверсе дома і ў ліфце звярніце ўвагу на люстэркі — таксама яго рук справа.

— Мне Любава дапамагае, — сціпла кажа гаспадар. — Яна татава дачка! Можа гадзінамі сядзець у інструментах. Цвікі, шрубы перабірае. Макар падрасце — справа пойдзе яшчэ хутчэй.

— У гэтую кватэру мы пераехалі ў мінулым годзе. Атрымалі ключы ў лютым, а ў маі ўжо перавезлі рэчы. Мы былі дзесьці пятай сям'ёй, якая засялілася ў новы дом. Да гэтага жылі з маёй матуляй на 20 квадратных метрах. Было цесна. Зараз па пакоях можна на скейце ганяць, — расказвае гаспадыня.

— Кватэру атрымалі пустую — адны сцены. Рамонт зрабілі прасценькі. З малымі дзецьмі праз два гады многае прыйдзецца мяняць. Але нават пры такім раскладзе працы яшчэ шмат. Не ўсё адразу, — дзеліцца Сяргей. — Па спецыяльнасці я сталяр, будаўнічы цясляр. Ва Украіне была свая невялікая вытворчасць мэблі. («Аліна, забяры ў Макара Любавіны духі! А то ён зараз сабе ў вочы пырсне», — ён заўважае ў руках сына небяспечную «цацку».) У Мінску да дэкрэтнага адпачынку таксама працаваў у кампаніі, якая займаецца мэбляй.

### «Каб заваяваць жанчыну, трэба пасябраваць з яе дзецьмі»

— Мы з Жэняй пазнаёміліся праз інтэрнэт. Абое фанацелі ад адной анлайн-гульні. Я з Херсонскай вобласці, яна — з Мінска. Сучасныя тэхналогіі твораць цуды! — успамінае Сяргей. — Жэня яшчэ той канспіратар. Сваю фатаграфію на аватарку не ставіла, імя таксама пазначыла чужое. Стала цікава, што за гулец у нас тут? Мяне ўразіла, як неардынарна разважае дзяўчына для сваіх 28 гадоў.

— Акуратней! Неўтаймоўная энергія, — ловіць Макара і Любаву, якія «пралятаюць» каля стала таты. — Не дадуць спакойна ўспомніць сваю маладосць. *(Смяецца.)* — 1 снежня мы пазнаёміліся, а 21-га — згулялі віртуальнае вяселле. Вядома, гэта ўсё жарты. Сур'ёзныя крокі пачаліся пазней, калі дамовіліся сустрэцца ўжывую. Жэня вельмі саромелася, нават хавалася! Але я «дацiснуў». Вось, разам ужо сем гадоў.

— Ён адразу да мамы згоды на шлюб пайшоў прасіць. Што яна, што я — абедзве не чакалі, — уступае жонка. — Мама пытае: «Ты добра падумала? Ты ўвогуле падумала?» У мяне тады ўжо былі Аліна і Максім. Новыя стасункі — сур'ёзны крок.

— Назаўжды ў Беларусь Сяргей прыехаў у маі, — працягвае Яўгенія. — Памятаю, на вуліцы вецер, дождж. Нашы людзі ў куртках, а ён з цягніка ў шортах выходзіць.

— Я спытаў: як апранацца? Жэня адказала «па-вясенняму». Я так і зрабіў! На Херсоншчыне людзі ў гэты час ужо купаюцца і загараюць, — тлумачыць мужчына.

Пра ўзаемаадносіны са старэйшымі дзецьмі Яўгеніі Сяргей адказвае з гумарам:

— Як там кажуць? Каб заваяваць жанчыну, трэба пасябраваць з яе дзецьмі! Таму выбару ў мяне не было, — усміхаецца. — Максім і Аліна тады былі меншымі, і знайсці да іх падыход было прасцей. Да таго ж я сам са шматдзетнай сям'і. Нас у бацькоў было чацвёра, няньчыў малодшых сястру і брата. Дзіцячую псіхалогію крыху на той момант разумеў.

### «Матуля, усё смачна, але давай наступны раз тата будзе гатаваць»

— З Любавай у дэкрэце сядзела я. Макар нарадзіўся, калі дачцэ было два гады дзевяць месяцаў. Аўтаматычна мой «адпачынак» працягнуўся. У Сяргея на той момант была цяжкая сітуацыя — фірма амаль абанкруцілася. І менавіта тады нам паступіла прапанова на льготны крэдыт на кватэру. Каб яго атрымаць, па нашым заканадаўстве абодва бацькі павінны быць працаўладкаваныя. Шукаць мужу новую работу — няма часу. Ды і я ўжо не магла больш сядзець дома! Грудзьмі Макара я карміла літаральна некалькі месяцаў. Так у пяць з паловай месяцаў я выйшла на работу, а сын перайшоў у надзейныя рукі таты, — расказвае Яўгенія.

— Жэня працуе намеснікам дырэктара аднаго з мінскіх гіпермаркетаў. Графік у яе тры праз тры, таму спачатку мы ўсё паспяхова сумяшчалі. То яна, то я заступалі на «змену», — жартуе бацька. — Цешча была на падхваце. Але калі Макар падрос і стаў патрабаваць да сябе больш увагі, стала складаней. Яшчэ і за Любавай нагляд патрэбен!



— Зараз, кажу з чыстым сумленнем, Сяргей у паўнавартасным дэкрэтным водпуску. Усё робіць сам. У свае выхадныя я нават не ўстаю завесці Любаву ў сад, — расказвае жанчына.

— Што ты тут намаляваў? Сонейка? Прыгожа! — падае Макару фламастары Сяргей. — Дачушка, не чапай! Гэта не цацкі! — забірае ў Любавы аб'ектыў нашага фатографа.

— Любава ў нас яшчэ той кадр, таму большасць гісторый будзе менавіта пра яе, — кажа гаспадыня. — Неяк папрасіла яна мяне спячы бліны. Есць і кажа: «Матуля, усё смачна, але давай наступны раз тата будзе гатаваць».

— Каронная страва Сяргея — смажаная бульба з цыбуляй! — уступае Аліна. — Чабурэкі смачныя атрымліваюцца.

— Па гатаванні ў мяне ніякіх праблем няма. Прачытаў рэцэпт — зрабіў. Галоўнае — жаданне! — лічыць мужчына. — Аліна вельмі дапамагае. І з малымі, і на кухні. Любава, нажніцы табе не патрэбныя. Тут вугал проста трэба адрываць. Бачыш? — тлумачыць бацька, адкрываючы дачцэ ёгурт. — Сынок, піць будзеш?

— Я працавала 30 і 31 снежня ўвесь дзень. Сяргей цалкам прыгатаваў святочны стол. І гэта з малым на руках! — горда кажа Яўгенія.

### «Чалавеку, які прыдумаў памперсы, трэба Нобелеўскую прэмію даць!»

— У нас ёсць дзяжурства па прыборцы сярод членаў сям'і. Макара, праўда, гэта не датычыцца, Любава корміць катоў. У панядзелак і аўторак дзяжурыць Аліна, у сераду, чацвер — Максім. Мы з Сяргеем — у пятніцу і на выхадных, — расказвае гаспадыня. — Дзяжурны мые посуд, ходзіць у краму па прадукты, прыбірае за жывёламі, выносіць смецце. Гэты метад мы перанялі ў іншай шматдзетнай сям'і. У іх дзевяць дзяцей: трое сваіх, шасцёра прыёмных. Схема, вядома, прыжылася не адразу. Былі незадаволеныя, але прызвычаіліся.

— Дзякуй часу, што бытавая тэхніка дайшла да нябачаных цудаў і дапамагае выжыць мужчыне ў дэкрэце! — дадае Сяргей. — А чалавеку, які прыдумаў памперсы, трэба наогул Нобелеўскую прэмію даць!

— Дарэчы, аб прыборцы. Прыходжу аднойчы з работы, гляджу — балкон у нейкіх карычнева-жоўтых палосках. «Гэта я морквай малявала, пакуль тата Макара спаць укладваў. А потым морква зламалася», — пачула ў апраўданне ад Любавы. Балкон «нянька» і «мастачка» мылі разам, — успамінае Яўгенія.

— Такое было ўсяго аднойчы, — абараняецца тата. — Увогуле, я прынцыпова рэжымны чалавек. Калі адбой у 22 гадзіны, то ўсе да гэтага часу павінны быць у ложку. А вось жонка ў гэтым плане мякчэйшая. Прычоскі Любаве раблю таксама я. Калісьці ўдзельнічаў у татавым злёце — на хуткасць плёў коску. Нешта нават выйграў. Адзінае, што мне не давяраюць, — гэта адзяваць малодшых дзяцей. Адзенне ў сад, на вуліцу, паліклініку раскладвае па стосіках жонка. Чаму? Калі выбірае ўборы тата, мама жахаецца! То колеры адзін да аднаго не пасуюць, то яшчэ што. Мне галоўнае, каб малым цёпла і зручна было! А матулі — каб яшчэ і прыгожа.

Нездарма ў вядомай песні гаворыцца «Тата можа, тата можа ўсё што заўгодна... Толькі мамай, толькі мамай не можа быць». Мама ёсць мама. Калі Жэня прыходзіць з працы, малы павісне ў яе на шыі і не адпускае: «Макаркіна матуля!»

Цікава, што, калі Жэня была ў дэкрэце, я разважаў: «Цудоўны час! Ляжы сабе на канапе, спі!» На самай справе гэта вельмі цяжкая праца! Іншы раз нейкі «дзэн» шукаць трэба, каб не сарвацца, — жартуе тата. — Я рыбалку люблю.

— Мужчына дзеліцца: жонка, седзячы дома з Любавай, заўсёды прасіла, каб ён ёй часцей тэлефанаваў: «Ты ж там усюды ходзіш, раскажы апошнія навіны?»



— Скажу шчыра, гэта раздражняла. Зараз тэлефаную жонцы: «Жэня, што дзе новага?!»

На пытанне, ці пайшоў бы Сяргей яшчэ раз у дэкрэтны адпачынак, мужчына адказвае пасля хвіліннай паўзы:

— Я ўжо хачу паўнавартасна працаваць, дарабіць нарэшце рамонт. Мару пра домік у вёсцы, Жэня — пра паездку на мора. Думаю, што на пятае дзіця пакуль не адважымся. Але хто ведае, як яно будзе?! Я — чалавек актыўны. Заўсёды за любы рух, акрамя галадоўкі! — смяецца мужчына і звяртаецца да малога: «Дружа мой, нешта мы загуляліся. У кагосьці па графіку ўжо павінен быць дзённы сон. Пойдзем, сынок, укладвацца спаць».

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

# Агратурыстычны комплекс «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы» — адпачынак з яркімі эмоцыямі



ІМІДЖ-ПРАЕКТ ААТ «ГРОДЗЕНСКІ МЯСАКАМБІНАТ»

**ГАРАДОК З ЗАБАВАМІ ЗНАХОДЗІЦЦА ЗА НЕКАЛЬКІ КІЛАМЕТРАЎ АД ГРОДНА.**

## У КУТОЧКУ ЗАПАВЕДНАГА ЛЕСУ

**У агратурыстычным комплексе «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы» можна паназіраць не толькі за жывёламі ў вальерах, але і за тымі, якія жывуць у прыродным асяроддзі.**



У самым сэрцы комплексу знаходзіцца рэштк і сапраўднага запаведніка. Тут гуляюць высакародныя і плямістыя алені, ланi, козы, якi, касулі. Назіраць за імі можна едучы на старажытным дыліжансе, фаэтоне альбо брычцы. Гэты арыгінальны транспарт з парай коней давязе ў самыя глухія куткі парку. Далучыць дзяцей да роднай прыроды, у тым ліку яе фаўны, жадаюць многія бацькі.

Цяжка ўявіць, але тут захавалася цудоўная алея стагадовых дубоў, што само па сабе можна назваць унікальнай з'явай. Пры гэтым стаіць цішыня, якую парушаюць хіба толькі птушкі і жывёлы. Казачны лес багаты на сюрпрызы.

Кажуць, што ў міні-заапарку налічваецца да 70 відаў жывёл. На тэрыторыі комплексу знаходзіцца пяць вадаёмаў, у якіх водзіцца рыба. А вакол — мосцікі, альтанкі. Вальеры для жывёл знаходзяцца ў асноўным якраз каля вадаёмаў. Качкі, экзатычныя курачкі жывуць побач з паўлінамі і страусамі. Тут імкнуцца паказаць гармонію чалавека і дзікай прыроды.

Дэндралагічны парк налічвае 400 відаў раслін, частка з якіх даволі рэдка сустракаецца ў Беларусі. Па перыметры пралягаюць акуратныя сцежкі і стаяць утульныя лаўкі, тут можна не толькі адпачыць, але і палюбавацца пейзажам.

## ГЭТЫ ДЗІВОСНЫ ДРАЎЛЯНЫ СВЕТ...

**Скульптуры, якія ўпрыгожваюць «Гарадзенскі маёнтак», ствараюцца тут жа. Традыцыйныя пленэры рэзчыкаў па дрэве збіраюць не толькі беларускіх, але і замежных майстроў.**

Асноўвай першага пленэру амаль дзесяць гадоў таму сталі вобразы на тэму «Паданні і казкі зямлі Прынёманскай». Беларускія і літоўскія майстры выразалі з дрэва 11 персанажаў. Так пачалася гэта традыцыя — упрыгожваць маёнтак драўлянымі скульптурамі, прычым прафесійных рэзчыкаў.

З цягам часу пашырылася геаграфія ўдзельнікаў. Праз некалькі гадоў на пленэр, акрамя беларусаў, прыехалі майстры з Польшчы, Літвы, Украіны і Расіі. Яны ўвасобілі ў дрэве разнастайных жывёл. Дарэчы, скульптуры сталі часткай арыгінальных лавак. Так з'явіліся, напрыклад, лаўка-такса, лаўка-паўлін і іншыя.

Не абышлі майстры і калядную тэму. На тэрыторыі комплексу з'явілася батлейка з біблейскімі персанажамі. За гэты час пленэр набыў устойлівы статус міжнароднага. Тут свой след у выглядзе арыгінальных скульптур пакінулі больш за паўсотні рэзчыкаў з пяці краін. Самым масавым па колькасці ўдзельнікаў стаў Х, юбілейны фестываль майстэрства, які прайшоў у жніўні мінулага года. Тут сваю фантазію праяўлялі адразу 22 майстры. На гэты раз бярвёны ўвасобілі сем нацыянальных танцаў — «лявоніху», «гапак», «польку» і іншыя.

Каларытныя драўляныя фігуры можна сустрэць у розных кутках агратурыстычнага комплексу. Па ўсім відаць, што яны ствараліся для добрага настрою. А «танцуючыя» скульптуры яшчэ і інтэрактыўныя: пры набліжэнні да іх гучыць адпаведная музыка.



## «ГРОДЗЕНСКАЯ КРЭПАСЦЬ. ПАРТЫЗАНСКІ ЛАГЕР»

**Тут можна атрымаць уяўленне аб тым, як жылі партызаны, якія баявыя дзеянні праходзілі ў гэтых мясцінах, і нават пазнаваць у званы-снарады.**

Імправізаваны партызанскі лагер створаны ў 2011 годзе на сродкі ААТ «Гродзенскі мясакамбінат». І гэта сапраўдны лагер, які раскінуўся сярод ляснога масіву. Аб гэтым сведчаць партызанская зямлянка, лясная школа, кухня, стайня і партызанскі касцёр. Прыкметна, што менавіта тут разгортваліся баі падчас дзвюх сусветных войнаў. Нават захаваліся акопы з Першай сусветнай вайны, дзе размяшчалася батарэя, а падчас Вялікай Айчыннай вайны тут знаходзіўся партызанскі лагер. З баявых снарадаў вытачаны імправізаваныя званы.

У музеі пад адкрытым небам сабрана баявая тэхніка: танкі, пушкі, зенітныя ўстаноўкі. Не так даўно тут з'явіліся новыя экспанаты — ваенна-транспартны самалёт АН-26 і самалёт СУ-24. Гэта сапраўдныя баявыя машыны.

Нядаўна адкрыты новы аб'ект — памятная часоўня, у якой размясцілі Аўгустоўскую ікону Божай Маці. Згодна з паданнем, яе вобраз з'явіўся рускім салдатам у 1914 годзе перад бітвай пад горадам Аўгустовам (зараз тэрыторыя Польшчы) і прадказаў перамогу.

Штогод тут праходзяць сустрэчы з ветэранамі. Калі заехаць сюды падчас святочных мерапрыемстваў на Дзень Перамогі, можна стаць удзельнікам музычна-тэатральнай праграмы, пакаштаваць салдацкай кашы, пасядзець каля вогнішча пад песні ваенных гадоў. У іншы час тут арганізавана экскурсійная праграма для турыстычных груп.

Гісторыка-культурны турыстычны цэнтр знаходзіцца ў шэрагу іншых аб'ектаў ваенна-турыстычнага маршруту. Непадалёку стаяць фарты Гродзенскай крэпасці 1887—1915 гадоў, якія падчас Вялікай Айчыннай вайны ўваходзілі ў склад Гродзенскага абарончага раёна.



## СВЯТА ГРАЦЫЁЗНЫХ СКАКУНОЎ

**У агратурыстычным комплексе штогод на пачатку верасня ладзіцца вельмі прыгожае свята — Дзень каня. Гэта сапраўднае шоу, якое дэманструюць удзельнікі мясцовага конна-спартыўнага клуба «Амадэус».**

Напрыклад, яны пераадольваюць бар'еры да 120 см, а некаторыя смельчакі-жакеі на сваіх скакунах бяруць і паўтара метра. Свята доўжыцца амаль увесь дзень і збірае вельмі многа прыхільнікаў. Сюды прыязджаюць цэлымі сем'ямі. Ёсць чым пазабавіцца і дзеткам. Ім вельмі падабаецца магчымасць пакарміць жывёлу, а хто больш смелы, можа пакатацца вярхом на рахманым коніку пад наглядам вопытнага жакея. Дарэчы, такая магчымасць тут існуе пастаянна. Кожны наведвальнік можа скарыстацца такой паслугай і адчуць сябе «на кані». Толькі тут можна ўбачыць выстаўку карэт. Усе яны ў рабочым стане і катаюць дзяцей і дарослых па тэрыторыі комплексу.

Праграма свята не абмяжоўваецца толькі выступленнем наезнікаў. Дарэчы, на мерапрыемства прыязджаюць прадстаўнікі іншых клубаў рэспублікі са сваёй тэатралізаванай экстрэмальнай праграмай. Разам з імі дэманструюць сваё майстэрства рыцары мясцовых клубаў баявых мастацтваў. Усе ахвотныя могуць атрымаць майстар-клас ад кузнецоў і рэзчыкаў.

Трэба сказаць, што на «Дзень каня» прыязджаюць турысты не толькі з рэгіёна, але і з іншых абласцей. Бываюць тут і замежныя госці — з Польшчы і Літвы. Свята праходзіць у выхадны дзень і можа стаць сапраўды незабыўнай падзеяй для сям'і, асабліва для дзяцей.

У Гарадзенскім маёнтку «Каробчыцы» шырока адзначаюць Масленіцу, Дзень закаханых, Каляды і іншыя святы.

## ЗЯВАНА ЧАСТУЕ ДАЛІКАТЭСАМІ

**У цэнтры турыстычнага комплексу высіцца сапраўдны замак. Адну з яго сцен упрыгожвае вітраж на дзевяць метраў з вобразам Зяваны — славянскай багіні палявання. Яна, як гаспадыня сядзібы, усіх запрашае ў свой рэстаран.**

І тут ёсць чым здзівіць. Рэстаран пабудаваны ў стылі старажытнай сядзібы, унутранае ўбранне адпавядае шляхецкім канонам.

Згодна з паданнем, багіня Зявана — дачка славянскага бога Перуна — спрыяла паляўнічым. Таму ў зале нямала трафеяў, а таксама ёсць гравюра самой уладальніцы замка. Тут усё дыхае старажытнасцю — цяжкія гардзіны, абіўка сцен, разьбяная драўляная мэбля, раскошныя каміны і, вядома, дэкор.

Як на сапраўднай старажытнай сядзібе, тут можна пачаставацца стравамі з дзічыны, прыгатаванымі па старадаўніх рэцэптах. Яны падаюцца пад салодкую медавуху, збіцень альбо гарачы глінтвейн. Усе напіткі таксама гатуюцца на самой сядзібе.

Падсілкавацца далікатэсамі можна і на прыродзе, напрыклад, у альтанцы комплексу альбо за яе межамі. Работнікі рэстарана гатовы прапанаваць такую паслугу, як кейтэрынг, ці выязное абслугоўванне.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

*УНП 500043292*



**Анатоль ГРЫШУК, генеральны дырэктар ААТ «Гродзенскі мясакамбінат», член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі:**

— Агратурыстычны комплекс — гэта імідж-праект Гродзенскага мясакамбіната. Ён пабудаваны не толькі для прадпрыемства. Прэзідэнт, калі ў мінулым годзе наведаў наш комплекс, даў высокую ацэнку гэтаму кірунку дзейнасці.

Расце колькасць наведвальнікаў партызанскага лагера. Мы не чакалі такога інтарэсу. У гэтым годзе ёсць планы пашырыць дэндрапарк з дапамогай дызайнераў Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта. Паспрабуем стварыць музей, які будзе адлюстроўваць чатыры пары года. Напрыклад, зімовая будзе з мядзведзем, ваўкамі. Заснежаныя дрэвы... І музыка адпаведная, з мяцеліцай, воўчым выццём. Вясна — глушцы, цецерукі, птушкі пяюць — вясна прыйшла. Восень — барсук хаваецца ў нару. Паглядзім, як дызайнер адпрацуе гэту задумку і ідэю.

Пакуль гасцініцы тут няма, бо гэта адпачынак аднаго дня, людзі прыходзяць, гуляюць, ядуць, з'язджаюць. Але ў вядомага гродзенскага інвестара ёсць планы будаваць непадалёку вакол возера пяць домікаў і невялікі гатэль. Магчыма, гэта паспрые прыезду іншагародніх і замежных турыстаў, якія змогуць пабываць на розных святах, што ладзяцца ўвесь год.

# ТАНЦЫ ПА-ДАРОСЛАМУ,

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Па праўдзе, я заўсёды марыла займацца балетам. Але ў пачатку 80-х у горадзе нават нічога падобнага не было, таму мама завяла мяне на народныя танцы. А калі мы пераехалі жыць на Сельмаш (*мікрараён у Гомелі*. — ***Аўт.***), то я трапіла ў танцавальны клуб «Палеткі», дзе займалася да самага выпуску са школы ў харэографа Юрыя Лабанава. Тут ужо быў і першы вальс, і кадрыль, і сучасныя павевы. Спартыўныя бальныя танцы ў нас толькі набіралі папулярнасць.

Прыкладна ў той час мы з Генам і пазнаёміліся. Я вучылася ў дзясятым класе, ён вярнуўся з арміі. Маладыя, прыгожыя. Літаральна праз тры дні пасля сустрэчы мы ведалі, што пажэнімся. Так яно і адбылося: пасля выпускнога падалі заяву ў загс. Не кажу, што гэта ўзор і так павінны рабіць іншыя. Але калі ты кахаеш чалавека і ўпэўнены ў ім, то навошта цягнуць? У нас шмат сяброў, якія таксама рана пажаніліся і добра жывуць не адно дзесяцігоддзе. Вось і ў нас сёлета жамчужны юбілей — 30 гадоў разам.

Калі мы рыхтаваліся да вяселля, вырашылі развучыць некалькі фігур для танца ў загсе. Па дапамогу звярнуліся да Юрыя Генадзевіча. Яшчэ тады ён сказаў мужу: «Гена, у цябе здольнасці! Трэба танцаваць». Але дзе там! Мы толькі пачыналі сямейнае жыццё, нарадзіўся сын, я вучылася на завочным. Адным словам, было не да вальса.

**— Калі вярнуліся да забытага хобі?**

— Калі сын з'ехаў вучыцца ў іншы горад, мы засталіся дома ўдваіх. Вечары каля тэлевізара пачалі ўваходзіць у звычку. Хоць мы і імкнуліся да актыўнасці: муж хадзіў на футбол, я — на фітнес, гэтага было недастаткова. Калі я сказала Гену, што мы ідзём на танцы, у яго быў шок.

**— Паставілі мужа перад фактам?**

— Не, але было блізка да гэтага (*усміхаецца*). Некалькі разоў я схадзіла на заняткі сама, паглядзела, што ды як. Аднак бальныя танцы — гэта абавязкова пары, таму трэба было знайсці і партнёрам.

**— Генадзь, вядома, не дапусціў, каб жонка танцавала з чужым мужчынам?**

— Гэта быў мой хітры ход, каб зацягнуць яго ў зал (*смяецца*). Праўда, згадзіўся муж толькі пры ўмове, што пасля танцаў будзе магчымасць паплаваць у басейне. Самае цікавае, што ён хутка ўцягнуўся. Пасля заняткаў у студыі глядзеў у інтэрнэце выступленні прафесіяналаў, сачыў за чэмпіянатамі свету, у яго з'явіліся свае «любімчыкі».

— Мяне ўкалолі, заразілі танцавальнай ліхаманкай! — пацвярджае словы жонкі Генадзь.

— І ўсё ж з самага пачатку для нас гэта была забава. Аднойчы мы выпадкова сустрэліся з Аляксеем Лабанавым — сынам Юрыя Генадзевіча. У яго свая школа танцаў у ЗША, час ад часу ён прыязджае на радзіму, праводзіць тут семінары. Нам вельмі пашанцавала, што Аляксей Юр'евіч узяўся трэніраваць нашу пару. Хоць на першых занятках і пажартаваў: «Лепш бы сталі. Стаіце вы добра». Кожны крок, позірк, узмах рукі — усяму мы вучыліся літаральна з нуля. Вынік — харэограф-сын амаль паўтарыў словы бацькі: «Гена, ты не тым займаўся па жыцці!»

**— Шлях да тытула чэмпіёнаў краіны быў складаны?**

— Тое, што мы танцуем, недарма адносіцца да спорту. Падчас трэніровак (заўважце, не рэпетыцый) пацееш не менш, чым у трэнажорнай зале. Мала таго, што ўсё цела ад кончыкаў пальцаў да пявек знаходзіцца ў напружанні, дык яшчэ трэба, каб яно рухалася ва ўнісон з партнёрам. Помню, развучвалі квікстэп, і Аляксей тлумачыў Гену, як правільна дыхаць падчас танца. Муж пасмейваўся, маўляў, я дзесяць гадоў футболам займаўся, скакаць умею і дыхальная сістэма ў мяне ў парадку. Праўда, праз некалькі хвілін ад яго самаўпэўненасці не засталося і слядоў: танец забраў усе сілы і збіў дыханне. Надзвычай складаны ў фізічным плане і венскі вальс.

Таму займацца даводзіцца шмат. Тройчы на тыдзень — уласна танцы ў клубе «Палеткі» пад кіраўніцтвам Юрыя і Аляксея Лабанавых. Мы працуем над еўрапейскай праграмай: квікстэп, павольны вальс, танга, павольны факстрот і венскі вальс. Дадаткова ідзе харэаграфія, дзе вучымся валодаць сваім целам, а таксама ходзім у басейн.

**— І ўсё дзеля чаго? Медалі ці задавальненне на першым плане?**

— Мой бацька казаў: «Нада шаваліцца!» Вось я і «шавалюся», — жартаўліва прыгадвае наказ старэйшых на гомельскай гаворцы Генадзь. — Мы не гонімся за рэйтынгамі і цвяроза ацэньваем свае магчымасці — як-ніяк прыйшлі ў гэты від спорту досыць позна (Вользе было 38, а мне — 43). Але ведаем, што можам дастойна прадстаўляць краіну на міжнародным узроўні. Напрыклад, летась у Германіі на сусветным першынстве мы абышлі 90 пар са 125. Згадзіцеся, нядрэнны вынік для гомельскай пары без сувязяў і з даволі сціплым досведам выступленняў? Летась удалося палепшыць рэйтынгі ў Дрэздэне і Вене.



З сынам Янам.

Нягледзячы на тое, што на міжнародных спаборніцтвах мы выступаем пад сцягам краіны і прадстаўляем Беларускі альянс танцавальнага спорту, усе выдаткі за ўдзел, пражыванне, праезд прыходзіцца браць на сябе.

— Але яно таго вартае. Танцы поўнасцю перамянілі наша жыццё, — далучаецца Вольга. — Ёсць пары, якія ставяцца да гэтага выключна як да спорту: прыехаў, выступіў, паехаў дадому. Мы глядзім на спаборніцтвы шырэй. Выязджаючы на чэмпіянаты за мяжу, абавязкова складаем культурную праграму: наведваем музеі, тэатры, нацыянальныя паркі. Калі б не танцы, мы хутчэй за ўсё не патрапілі б у многія гарады. Гэтыя паездкі замяняюць нам водпуск.

**— У якіх краінах ужо пабывалі? Што больш за ўсё запомнілася?**

— Аб'ехалі палову Еўропы. Там зусім іншая культура ўспрымання бальных танцаў. Паўфіналы і фіналы спаборніцтваў — гэта ўжо не проста спорт, а цэлае шоу, ці правільней казаць, баль. На іх прыходзяць як у Вялікі тэатр. Сімфанічны аркестр, афіцыянты ў белых пальчатках, свечкі. Нават гледачы апранаюць вячэрнія касцюмы, каб падчас перапынкаў таксама выйсці на паркет і павальсаваць, — кажа Генадзь. — «Сеньёры» там дзеляцца на некалькі ўзроставых катэгорый, кожная з якіх налічвае па некалькі сотняў удзельнікаў. У нас на першынстве краіны прадстаўнікоў гэтай групы можна пералічыць па пальцах.

— Разам з тым, нельга сказаць, што беларусам бальныя танцы нецікавыя. Гэта класіка. Яна, як вядома, ніколі не старэе. Студый і клубаў хапае і ў нас. Народ спрабуе, уваходзіць у смак. Але, магчыма, пакуль не гатовы да выхаду на спаборніцтвы.

**— Як сын ставіцца да вашага захаплення?**

— Вельмі ганарыцца. Ён, дарэчы, калі маленькі быў, таксама рваўся на заняткі танцамі ўслед за дзяўчынкай, якая яму падабалася. Але мы аддалі яго ў музычную школу. Зараз разумею, што паступілі правільна. Бальныя танцы — гэта спорт, і каб у ім дасягнуць значных вынікаў, трэба выкладвацца па поўнай. Дзеці трэніруюцца не менш за дарослых, няўдачы ўспрымаюць вастрэй. Нават у нас, дарослых танцораў-аматараў, бываюць расчараванні і слёзы. Што ўжо казаць пра 12—15-гадовых падлеткаў?

Сын не шкадуе, што тады не пайшоў танцаваць. Зараз ён усур'ёз цікавіцца трыятлонам, бегае марафоны. Трэніроўкі штодня па раскладзе. Кажа, што мы яго станоўчы прыклад.

**— Як танцы паўплывалі на вашы адносіны?**

— Усё залежыць ад таго, з якога боку глянуць. Не буду ўтойваць: падчас трэніровак можам і пасварыцца. Мы павінны рухацца як адзіное цэлае, а гэта атрымліваецца не заўсёды. Таму, бывае, што дадому з залы я іду пехам (астываю пасля канфлікта), а муж едзе на машыне. У парыве эмоцый магу сказаць: «Усё, больш ніякіх танцаў!» Але калі зноў зайграе музыка, пачуецца шалясценне сукенак — не стрымацца.

У той жа момант, танцы робяць адносіны глыбейшымі, як і любое іншае сумеснае хобі. Толькі тут у вас ёсць магчымасць паказаць свае пачуцці праз мастацтва руху і зрабіць гэта так, каб усе «ахнулі».

**— Дома танцуеце?**

— З кухні ў залу ўваходзім толькі ў рытме танга, — жартуе Генадзь.

